

Чаму прыватныя ВНУ аказаліся ў аўтсайдарах?

СТАР. 2



Вынаходствы маладых: ці з'явяцца ў нас нобелеўскія лаўрэаты?

СТАР. 1-4



Музыка, якая... лечыць

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 СНЕЖНЯ 2013 г. СЕРАДА № 233 (27598) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ДЗЯРЖАВА МАБІЛІЗУЕЦЦА ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ВОСТРЫХ ПЫТАННЯЎ

Рэспубліканская нарада з удзелам Прэзідэнта, прысвечаная праблемам у будаўніцтве і рабоце з кіруючымі кадрамі, доўжылася ўчора каля 6 гадзін

**Па значнасці ўчарашняе мерапрыемства Прэзідэнт параўнаў з пленумам Цэнтральнага Камітэта партыі ў савецкія часы. Калі з усіх рэгіёнаў збіраліся кіруючыя кадры, адкрыта абмяркоўвалі найважнейшыя пытанні жыцця грамадства.**



Фотаздымкі БЕЛТА.

### Падобныя сходы стануць рэгулярнымі

«Тут прысутнічае ўся вертыкаль выканаўчай улады краіны, — сказаў Прэзідэнт. — Такога фармату і шырокага складу ўдзельнікаў патрабуюць як актуальнасць тэматыкі, так і неабходнасць усебаковага абмеркавання рэальнай сітуацыі ў вельмі важных сферах дзейнасці». Кіраўнік дзяржавы прапанаваў як мінімум раз у паўгода збірацца ў такім складзе, каб на сістэмнай падставе даваць сігналы грамадству аб праблемах, якія ўзнікаюць, і шляхах іх вырашэння.

Прэзідэнт даручыў ураду сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта ўнесці прапановы па галіновай тэматыцы для наступных нарад. На думку кіраўніка дзяржавы, першачарговага разгляду патрабуюць праблемы ЖКГ і развіццё аграпрамысловага комплексу.

На парадку дня ўчарашняй нарады былі два пытанні — аб праблемах развіцця будаўнічай галіны і аб неабходнасці ўдасканалення працы з кіруючымі кадрамі. Аляксандр Лукашэнка патлумачыў, чаму выбрана менавіта будаўнічая сфера: «Ды таму што, па-першае, вельмі шмат наракання людзей у яе адрас. А па-другое, сапраўды тут назбіралася столькі негатыву, што для яго пераадолення неабходны рашучыя дзеянні на ўсіх узроўнях кіравання, у тым ліку на самым высокім».



### Сферы, ад якіх залежыць лёс людзей

Прэзідэнт падкрэсліў, што будаўнічая галіна ў цэлым і жыллёвае будаўніцтва ў прыватнасці — тыя галіны, ад працы якіх напрамую залежыць лёс многіх людзей. «У савецкія часы бытаваў такі выраз: «Жыццё даецца чалавеку адзін раз, а кватэра і таго радзей, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — З той пары прайшло нямала часу. Змянілася краіна, змяніўся свет наўкола. Аднак жыллё па-ранейшаму застаецца найважнейшай катэгорыяй ацэнкі дабрабыту кожнага чалавека, кожнай сям'і. Каб пабудаваць дом, кватэру, людзі аддаюць апошняе. Па мерках простага чалавека, на ўзвядзенне жылля патрабуюцца велізарныя фінансавыя сродкі. І людзям прыходзіцца ўсё жыццё або збіраць грошы, або ўлазіць у даўгі, а потым разлічвацца па крэдытах».

Прэзідэнт лічыць, што ў жыллёвым будаўніцтве сфакусіраваны сур'ёзныя праблемы ўсяго будаўнічага комплексу краіны. На такое становішча спраў, апрача аб'ектыўных прычын, значна паўплывалі суб'ектыўныя фактары. «Па сутнасці, большасць праблем стварылі самі сабе ўпраўленцы, праекціроўшчыкі, будаўнікі і мы з вамі. Каб пераадолець назапашаную кучу негатыву, давялося ствараць міжведамасную групу з шырокімі паўнамоцтвамі.

СТАР. 2

# БЕЛЫ ТАНЕЦ



г. Мінск

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Расіяне лічаць Беларусь самай паспяховай краінай СНД

**Такія вынікі даследавання, абнародаваныя Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі (УЦВГД), паведамляе БЕЛТА.**

Паводле даных сацыёлагаў, роўна палавіна расіян назвала Беларусь самай паспяховай дзяржавай Садружнасці. 35 працэнтаў апытаных назвалі Казахстан і 21 працэнт — Украіну. У мінулым годзе аналагічныя адказы далі, адпаведна, 45 працэнтаў, 33 працэнты і 19 працэнтаў апытаных УЦВГД.

Найбольш надзейнымі партнёрамі Расіі 51 працэнт рэспандэнтаў лічаць Беларусь і 37 працэнтаў — Казахстан. Украіна са значным адставаннем (18 працэнтаў) на трэцім месцы. Супрацоўніцтва з Азербайджанам і Арменіяй падтрымліваюць па 5 працэнтаў рэспандэнтаў, з Кыргызстанам, Узбекістанам, Туркменістанам і Грузіяй — па 2 працэнты. Надзейнасць Малдовы як партнёра для вядзення бізнесу адзначылі 3 працэнты рэспандэнтаў, Таджыкістана — 1 працэнт.

Лідарамі рэйтынгу даверу кіраўнікам дзяржаў СНД, на думку расіян, з'яўляюцца Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка (41 працэнт) і Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў (33 працэнты). Замыкае тройку таксама з прыкметным адрывам украінскі лідар Віктар Януковіч — яго назвалі толькі 10 працэнтаў апытаных. Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў выклікае давер у 5 працэнтаў удзельнікаў апытання. Кіраўнікі Кыргызстана, Арменіі, Узбекістана, Туркменістана, Таджыкістана, Грузіі і Малдовы карыстаюцца даверам толькі ў невялікай часткі расіян (ад 1 працэнта да 3 працэнтаў).

У Беларусі, Казахстане і Украіне найбольш спрыяльнае асяроддзе для вядзення бізнесу — такой пазіцыі прытрымліваюцца, адпаведна, 30 працэнтаў, 24 працэнты і 17 працэнтаў удзельнікаў апытання. Іншыя члены СНД былі адзначаны меншай доляй расіян.

Усерасійскае апытанне УЦВГД было праведзена 16-17 лістапада. Апытана 1600 чалавек. Статыстычная хібнасць не перавышае 3,4 працэнта.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама:**

***«Усе пытанні забеспячэння жыллём ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебскай вобласці будуць вырашаны ў пачатку 2014 года. Наш святы абавязак — стварыць для кожнага ветэрана камфортныя і годныя ўмовы жыцця. Трэба зрабіць так, каб ветэраны адчувалі сябе ў поўнай меры пераможцамі. Пільнай увагі патрабуюць і пытанні аказання медыцынскай дапамогі. Тут трэба наладзіць штодзённы кантроль. Калі ёсць неабходнасць — перавезці ветэранаў у стацыянарную ўстанову. Асабліва гэта тычыцца тых, хто жыве ў сельскай мясцовасці».***

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +3° |
| Віцебск | +1° |
| Гомель | –4° |
| Гродна | +3° |
| Магілёў | –2° |
| Мінск | +1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9410,00 | ▲ |
| Еўра | 12930,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 287,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1144,07 | ▼ |

# АГУЛЬНАЕ НЕБА



10 снежня на аэрадроме 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі на сумеснае баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне Саюзнай дзяржавы заступілі дзяжурныя экіпажы ВПС і войскаў СПА Беларусі і першага камандавання ВПС і СПА Заходняй ваеннай акругі Узброеных сіл Расіі. На авіябазе ў Баранавічах дыслацыравана авіяцыйнае звяно ў складзе 4 знішчальнікаў Су-27П ВПС Расіі. На здымку: трэніроўка перад баявым дзяжурствам па ахове паветранай прасторы Саюзнай дзяржавы.

**Фота БЕЛТА.**

## ■ Сустрэча без абцасаў

# «ШЧАСЦЕ — НЕ МЕСЦА, КУДЫ МОЖНА ПРЫЙСЦІ»

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алена БЕРАСНЕВА падзялілася ўласным рэцэптам жыццярадаснасці і распавяла, як да яе трапіла ручка Васіля Быкава.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Сустрэліся з Аленай Берасневай пасля працоўнага дня ў трэнажорнай зале. «Прыходжу сюды, калі маю час», — вітае прыязнай усмешкай Алена Пятроўна і пачынае круціць педалі велатрэнажора. Быццам бы паскарае тэмп свайго жыцця, якое не так даўно кардынальна змянілася. Год таму вядомая на Гродзеншчыне журналістка вырашыла ўдзельнічаць у выбарах у Палату прадстаўнікоў. І перамагла ў няпростай барацьбе траіх мужчын. Сёння, прызналася, хоць часам і сумуе па рэдактарскай працы, але не шкадуе, што змяніла яе на дэпутацкую дзейнасць.

### Пра мыс Шміта, хакей і вершы Вадзіма Дзевятоўскага

Прызвычайвацца да новага — для мяне звыклая справа (*усміхаецца*). Мой тата быў афіцэрам, таму мы пераязджалі з месца на месца. Было цяжка развітвацца з сябрамі і... любімымі кнігамі. Калі пакавалі рэчы, часам даводзілася пакідаць тое, што не змяшчалася ў кантэйнер. На мысе Шміта, а затым у Ніжніх Крастах, адкуль можна было вылецець толькі самалётам, пакінулі наогул усё...

СТАР. 3

## ■ «Круглы стол»

# «НАВУКА МАЛАДЫХ: СЁННЯШНІЯ РЭАЛІІ І ПАНАРАМА БУДУЧЫНІ»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



**Тым, што навука — рухавік прагрэсу, ужо нікога не здзівіш. Сёння без выкарыстання дасягненняў фундаментальнай і прыкладной навукі немагчыма ўявіць эканамічнае, сацыяльнае і тэхнічнае развіццё чалавецтва. Па вялікім рахунку, ад яе стану залежыць узровень жыцця грамадства. Таму развіццё навукі з'яўляецца і адным з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі Беларусі.**

Невыпадкова кажуць, што найкаштоўнейшы фонд любой дзяржавы — яе моладзь. Маладосць для вучонага — залаты ўзрост: новыя ідэі, іх імгненная рэалізацыя. Прыток у беларускую навуку перспектыўных маладых кадраў зрабіў сваю справу: за апошні час айчынная навука прыкметна змянілася — яна памаладзела.

Маладыя навукоўцы робяць яе запатрабаванай у эканоміцы і грамадстве, яна дынамічна развіваецца, на яе рахунку ўсё больш дасягненняў сусветнага ўзроўню. Вядома, ёсць і пэўныя праблемы. Найперш гэта тычыцца матэрыяльна-тэхнічнай базы. І як у такіх умовах працаваць маладому спецыялісту, які, можа, гатовы на рэвалюцыйныя змены ў навуцы? І наколькі патрэбны сучаснаму грамадству гэтыя вынаходкі?

Каб знайсці адказы на шматлікія пытанні і ўвогуле пагаварыць пра ролю маладога вучонага ў сучаснай навуцы, за «круглым сталом» у рэдакцыі газеты «Звязда» сабраліся навукоўцы з Акадэміі навук і айчынных ВНУ краіны. Амбіцыйнасць, характэрная моладзі, адыграла сваю ролю — добрая атрымалася дыскусія!

СТАР. 4

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## КАНАДА ЗАЯВІЛА ПРЭТЭНЗІІ НА ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС

Улады Канады афіцыйна заявяць у ААН тэрытарыяльныя прэтэнзіі на Паўночны полюс. Аб падрыхтоўцы адпаведнай заяўкі паведаміў кіраўнік канадскага МЗС Джон Бэйрд. Паводле слоў Бэйрда, канадскім навукоўцам трэба даказаць, што полюс уваходзіць у зону кантынентальнага шэльфа іх краіны. У пачатку снежня Канада падала ў ААН заяўку з просьбай уключыць у межы кантынентальнага шэльфа зону плошчай 1,2 мільёна квадратных кіламетраў. Полюс у гэтую зону не трапляе, аднак заяўка, па словах Бэйрда, змяшчае папярэднюю інфармацыю, якая ў далейшым дазволіць адсунуць мяжу шэльфа яшчэ далей.

Цяпер Паўночны полюс і прылеглая да яго частка Паўночнага Ледавітага акіяна не належаць ні адной з краін. Расія, Канада, Нарвегія, Данія і ЗША маюць у Арктыцы выключныя эканамічныя зоны, якія распасціраюцца на 370 кіламетраў ад іх берагоў. Цікавасць да Арктыкі звязана з тым, што рэгіён разглядаюць як крыніцу карысных выкапняў — у прыватнасці, газу і нафты.

## У ЛІТВЕ ПЕРАДУМАЛІ АДМАЎЛЯЦЬ У ПЕНСІЯХ ПРАВЕДНІКАМ СВЕТУ

Улады Літвы перагледзяць праект пастановы, якая перашкаджае прызначыць дадатковыя пенсіі праведнікам свету (яны ратавалі яўрэяў у перыяд нацысцкай акупацыі Еўропы), што жывуць у рэспубліцы. Пра гэта паведамляе DELFI са спасылкай на канцлера ўрада Альмінаса Мачуліса. Паводле яго слоў, міністэрству сацыяльнай абароны і працы даручана падрыхтаваць удакладнены варыянт дакумента, які трэба прадставіць парламенту не пазней чым 11 снежня. Папярэдняе рашэнне ўрада па гэтым пытанні выклікала шквал крытыкі. На мінулым тыдні Кабмін прапанаваў дэпутатам Сейма не разглядаць законапраект, які надаваў людзям, што ратавалі яўрэяў, прававы статус змагароў за свабоду. Гэты статус дазволіў бы ім атрымліваць у Літве дадатковую пенсію.

## АПУБЛІКАВАНЫ СПІС КАРЫСНЫХ ДЛЯ МОЗГА ПРАДУКТАЎ



У рацыён кожнага чалавека павінны ўваходзіць прадукты, якія стымулююць мозг і павышаюць разумовую актыўнасць. Спіс такіх прадуктаў склалі навукоўцы. Такім чынам, на першым месцы аказалася тлустая рыба, багатая на кіслату амега-3. Гэтае злучэнне ўдзельнічае ў выпрацоўцы шэрага рэчыва ў галаўным мозгу. Рыбу варта есці 1—2 разы на тыдзень. Далей ідуць малочныя прадукты, уключаючы само малако. Злучэнні з іх лёгка засвойваюцца мозгам, што паляпшае абмен у клетках. Усё гэта пазітыўна адбіваецца на інтэлектуальных здольнасцях чалавека. Як даказалі эксперыменты, у людзей, якія рэгулярна ўжываюць малако, паляпшаліся паказчыкі памяці і лагічнага мыслення. Бабовыя — крыніца фоліевай кіслаты і вітаміну B, размясціліся на трэцім месцы. Яны ўмацоўваюць памяць. Далей ідуць таматы, якія змяшчаюць антыаксідант лікапін. Ён абясшкоджвае свабодныя радыкалы, здольныя нанесці шкоду клеткам мозга. Прычым пасля тэрмічнай апрацоўкі канцэнтрацыя лікапіну ўзрастае. Злучэнне таксама ачышчае арганізм, стымулюе абнаўленне клетак і амаладжэнне скуры. Варта адзначыць, што, апроч пералічаных прадуктаў, у поле зроку навукоўцаў не раз траплялі журавіны, чарніцы, капуста, буракі і шпінат.

ISSN 1990 - 763X

13233

9771990763008

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ТУРЦЫІ ПРАД'ЯЎЛЕНЫ АБВІНАВАЧВАННІ 255 УДЗЕЛЬНІКАМ МАСАВЫХ ПРАТЭСТАЎ



Турэцкая пракуратура 10 снежня прад'явіла розныя абвінавачванні 255 маніфестантам, уключаючы семярых замежнікаў, за ўдзел у акцыях пратэсту, якія прайшлі ў Стамбуле і іншых гарадах краіны мінулым летам, паведамляюць інфармагенцтвы. Абвінавачванні вар'іруюцца ад парушэння законаў аб мітынгах да прычынення шкоды культавым збудаванням і пакрывання злачынцаў. Масавыя акцыі пратэсту пачаліся ў Турцыі з невялікай акцыі эколагаў, якія пратэставалі супраць высечкі сталічнага парку Гезі. Да дэманстрантаў далучыліся дзясяткі тысяч іх аднадумцаў, а патрабаванні хутка змяніліся на палітычныя. Для разгону дэманстрантаў паліцыя ўжыла вадамёты, гумовыя дубінкі, слёзатачывы газ і іншыя спецыяльныя сродкі. У выніку не менш за шэсць чалавек загінулі, да васьмі тысяч атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці.

## КАРАТКА

Галоўная ёлка Беларусі запаліць свае агні ў Палацы Рэспублікі 27 снежня.

Інфляцыя ў Беларусі ў лістападзе 2013 года запаволілася да 1,6 працэнта, у кастрычніку яна складала 1,9 працэнта. Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лістападзе адносна кастрычніка 2013 года склаў 101,6 працэнта, да снежня 2012-га — 113,8 працэнта.

Мінскія ўнівермагі 15 снежня правядуць адзіны дзень зніжак. У гандлёвым доме «На Нямізе», ЦУМе, ГУМе, гандлёвым цэнтры «Кірмаш» будзе прадугледжана зніжка 15% на ўсе групы нехарчовых тавараў.

У Мінску з 9 па 15 снежня праводзіцца Тыдзень беларускай кухні. У праекце прымаюць удзел рэстараны «Славянскі кут», «Гамбрынус», «Старыя традыцыі» і «Спадарожнік», а таксама кавярні «У гаспадыні», Blackberry, «Традыцыя», «Мая дарагая» і «Сатурн» . Наведвальнікам гэтых устаноў прапануецца шэсць страў нацыянальнай кухні, прыгатаваных па адзінай рэцэптуры і па адным і тым жа кошце незалежна ад тыпу і нацэначнай катэгорыі ўстановы. Журавінавы морс — Br5 тыс., суп «Граматка» — за Br15 тыс., сялянская закуска або рыбнік — Br35 тыс. За Br55 тыс. пададуць гуляш па-радзівілаўску з грэчкай ці пячыста з дранікамі.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» с 12.12.2013 вводит новый срочный банковский вклад в иностранной валюте

«Новогодний»

на следующих условиях:

- ✓ срок хранения вклада 3 месяца;
- ✓ размер процентной ставки по вкладу:
  - за 1-й месяц хранения — 5% годовых;
  - за 2-й месяц хранения — 5,5% годовых;
  - за 3-й месяц хранения — 6% годовых.
- ✓ минимальная сумма первоначального взноса и сумма неснижаемого остатка вклада 1 000 долларов США или 1 000 евро;
- ✓ возможность до срока возврата вклада совершать расходные операции в пределах части остатка вклада, превышающей сумму неснижаемого остатка вклада;
- ✓ пополнение вклада в течение первых 2-х месяцев хранения.

С 10.12.2013 возобновлено оформление сберегательных сертификатов в белорусских рублях со сроком обращения 1 месяц, процентная ставка по вновь оформляемым сберегательным сертификатам установлена в размере 45% годовых, минимальная сумма размещения — 10 000 000 белорусских рублей.

Подробности по телефону **147**, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**

# ДЗЯРЖАВА МАБІЛІЗУЕЦЦА ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ВОСТРЫХ ПЫТАННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падкрэсліваю — міжведамасную, таму што самым негатыўным чынам на працэсах, якія адбываюцца ў будаўніцтве, адбівалася няўзгодненасць дзеянняў, недысцыплінаванасць, узаемныя прэтэнзіі розных структур і вузкакарпаратыўныя інтарэсы», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што перад міжведамаснай рабочай групай стаяла задача дэталёва вывучыць недахопы на ўсіх стадыях інвестыцыйнага працэсу і з улікам міжнароднага вопыту акрэсліць шляхі развіцця будаўнічай галіны на бліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву.

## Апошні тэрмін — 1 ліпеня

Прэзідэнт паставіў задачу завяршыць будаўніцтва апошняга праблемнага дома да 1 ліпеня наступнага года. Паводле слоў Прэзідэнта, неапраўдана зацягнутыя тэрміны жыллёвага будаўніцтва і нястрымны рост цэн на пратэрмінаванае жыллё выклікаюць найбольшую незадаволенасць людзей. Раскрыты абуральныя факты падману дольшчыкаў. «Знайшліся дзеячы, якія аб'явілі аб будаўніцтве дома, з дольшчыкаў збіралі грошы, а потым транжырылі іх. У выніку пакідалі людзей і без жылля, і без сродкаў. Можна гаварыць у гэтым выпадку аб стварэнні пірамід», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што па яго даручэнні сёлета ў чэрвені праведзена інвентарызацыя ўсіх праблемных будоўляў. «Сёння з 380 дамоў, уключаных у пералік праблемных, ужо ўведзена ў эксплуатацыю 200. Да канца года, як запэўніваюць мясцовыя органы ўлады, будуць уведзены ў эксплуатацыю амаль 100 дамоў, і 80—85 даўгабудаў будуць уведзены ў 2014 годзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў асаблівую ўвагу ўдзельнікаў нарады на неабходнасць дакладна выканаць названыя тэрміны. «Раней я распарадзіўся да канца гэтага года ўсе праблемныя дамы ўвесці ў строй. Але палічылі — праслязіліся. Добра, калі з 400 дамоў застанецца 80 на першае паўгоддзе наступнага года, — гэта людзі яшчэ вытрымаюць. Але, не дай бог, хоць паўдома не будзе ўведзена. І не ўздумайце мудраваць са статыстыкай і справаздачнасцю. Кожны дом будзе правераны міжведамаснай групай, якую ўзначальвае кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад усёй вертыкалі ўлады, асабліва ад старшынь райвыканкамаў, давесці да лагічнага завяршэння ўсе праблемныя будоўлі жылля. «Ёсць графікі, вызначаны адказныя. Кантралюйце выкананне прынятых абавязацельстваў, напружвайце будаўнікоў», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады.

Прэзідэнт перакананы, што з'яўленне новых дамоў са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва трэба лічыць надзвычайным выпадкам і трэба зрабіць усё, каб іх не ўзнікала. У якасці негатыўнага прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў выпадак з дзейнасцю ТАА «Аблічча», якое правяліла будаўніцтва некалькіх аб'ектаў у Брэсцкай вобласці. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы ўказаў на неабходнасць большага кантролю за жыллёвым будаўніцтвам з боку мясцовых органаў улады. «У галаве не ўкладваецца, куды глядзела мясцовая ўлада на працягу шэрагу гадоў? Збоі ў рабоце гэтых гора-будаўнікоў былі відавочныя, — сказаў Аляксандр Лукашэнка наконт выпадку ў Брэсцкай вобласці. — Чаму не прымалі меры? Няўжо не бачылі? І год не бачылі, і паўтара года таму не заўважалі. Чакалі, пакуль Прэзідэнт умяшаецца і прышле групу для разбору?» Цяпер на праблемных аб'ектах працуюць будаўнікі, з'явілася фінансаванне. І калі раней перспектывы ўводу ў строй гэтых дамоў нават не прагляладаліся, то цяпер можна сцвярджаць, што праблема будзе вырашана. Дамы абавязуюцца ўвесці сёлета да канца года, але, вядома, не за дзяржаўны кошт. Прэзідэнт асабліва падкрэсліў, што дзялкі, якія ўкралі грошы, павінны ўсё вярнуць, прычым у двух-, трохразовым памеры.

Разам з тым, праблема даўгабудаў не ва ўсіх рэгіёнах вырашаецца паспяхова. Да гэтага часу Мінгарвыканкам не можа разабрацца з даўгабудам ЗАТ «Тэрабудінвест» на вуліцы Прытыцкага. Будоўля там спынена, забудоўшчык — банкрут. «Гарвыканкам наогул ніяк не дзейнічае. Кожны дзень нявызначанасці — гэта дадатковыя страты і рост цаны. Людзі павінны заплаціць роўна столькі, колькі вызначана, і ні капейкі больш», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт запатрабаваў ад кіраўнікоў на месцах надаваць больш пільную ўвагу жыллёваму будаўніцтву. Паводле яго слоў, міжведамасная рабочая група падрыхтавала па выніках работы цэлы «альбом», каб любы чалавек, нават неспецыяліст, разумеў, з чаго пачынаць будаўніцтва і як яго завяршаць. З аднаго боку, на думку Прэзідэнта, гэты «альбом» будзе дапамагаць мясцовым уладам, паколькі не трэба нічога выдумляць, а проста выконваць напісанае ў ім. «З іншага боку, ніякіх альбомаў нікому не трэба. Старшыні рай-, гар-, аблвыканкамаў будуюць у сярэднім адзін дом у год. Ці не могуць яны разабрацца з гэтым домам? — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. — А мы ім тут альбомы распісваем і вучым, як трэба будаваць».



Фотаздымкі БЕЛТА.

## Парушэнні ў рэгламенце

Аляксандр Лукашэнка настойвае на жорсткім выкананні рэгламенту будаўнічага бізнесу. «Я неаднаразова патрабаваў забяспечыць жорсткае выкананне рэгламенту будаўнічага бізнесу, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Усё павінна рабіцца выразна, хутка, але строга па прапісаных правілах. Хуткасць не павінна дасягацца за кошт паспешлівасці і ігнаравання абавязковых стадый».

Прэзідэнт лічыць, што ўрад павінен усё адрэгуляваць так, каб ніхто не паставіў пад удар нармальны ход усяго будаўніцтва, атрымаўшы сіюмінутную выгаду. «Для інвестараў, заказчыкаў, праекціроўшчыкаў і падрадчыкаў — усіх удзельнікаў будаўнічага працэсу — выпрацаваны парадак павінен стаць кіраўніцтвам да дзеяння», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.



Паводле яго слоў, нярэдка бывае так, што заказчыкі, не маючы дакладнага задання на праектаванне і імкнучыся хутчэй заняць будаўнічую пляцоўку, пачынаюць працы без праектнай дакументацыі ў разліку, што яе можна распрацоўваць падчас будаўніцтва. Маўляў, гэта прывядзе да эканоміі часу і сродкаў. Аднак у рэальнасці ўсё атрымліваецца наадварот. Перапрацоўкі і прастоі падрадных арганізацый у чаканні змен праектаў прыводзяць да дадатковых работ і перарасходу грошай. Таму Прэзідэнт запатрабаваў лічыць паралельнае праектаванне выключэннем з правілаў, якое можа прымяняцца толькі да добра падрыхтаваных арганізацый, прычым толькі па рашэнні кіраўніка дзяржавы.

## Участкі — праз аўкцыён

У сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама тэму прадастаўлення зямельных участкаў для будаўніцтва. Ён падкрэсліў, што і зараз вельмі вялікая колькасць пляцовак даецца забудоўшчыкам бясплатна, быццам бы каб знізіць кошт будаўніцтва. Але на практыцы часта за гэтым ідзе зусім не зніжэнне цаны за квадратны метр, а толькі павелічэнне прыбытку забудоўшчыка. З гэтай прычыны, падкрэсліў Прэзідэнт, многія прадпрыемствы, каб атрымаць бясплатную зямлю, ідуць на хітрасці, якія мяжуюць з махлярствам.

Аднак, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ільготнае прадастаўленне ўчасткаў першапачаткова закладвалася для стварэння новых вытворчасцяў, змяншэння кошту жыллёвага будаўніцтва. Таму Аляксандр Лукашэнка патрабуе, каб асноўным інструментам прадастаўлення ўчасткаў быў менавіта аўкцыён. «У ідэале льготнае прадастаўленне зямлі павінна застацца толькі для будаўніцтва жылля па дзяржаўным заказе», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што нярэдка ўчасткі, няхай і законна, атрымліваюць грамадзяне і суб'екты гаспадарання не для будаўніцтва, а для спекуляцыі — прамога або схаванага перапродажу. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу перад старшынямі райвыканкамаў і губернатарамі забараніць любое адчужэнне ўчастка да таго часу, пакуль уласнік або арандатар не зробіць тое, для чаго зямля была прадастаўлена.

«Мяне інфармуюць, што дагэтуль у сферы зямельных адносін не выкаранена валакіта і бюракратызм, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Зацягваюцца тэрміны выдзялення зямельных участкаў, заднім чыслом афармляюцца рашэнні, не прымаюцца своечасовыя меры па кантролі за мэтавым выкарыстаннем участкаў». Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў найбольшай ступені гэтым грашаць Мінск і Мінская вобласць. Таму ў звароце да мэра Мінска Мікалая Ладуцькі і губернатара Мінскай вобласці Сямёна Шапіры Прэзідэнт запатрабаваў навесці парадак з размеркаваннем і выкарыстаннем зямельных участкаў.

## Падстава для даверу

Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду і Вярхоўнаму Суду Беларусі распрацаваць і зацвердзіць тыпавы дагавор, які павінен заключацца паміж грамадзянамі і забудоўшчыкамі пры будаўніцтве жылля.

Паводле слоў Прэзідэнта, у гэтым дагаворы ў абавязковым парадку трэба прадугледзець строгія абавязацельствы бакоў па фінансаванні, тэрмінах і якасці будаўніцтва. «Усе такія дагаворы павінны знаходзіцца ў літаральным сэнсе на стале ў старшыні райвыканкама. Кантроль за іх выкананнем — сфера адказнасці мясцовай улады», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. На яго думку, да плацежаздольнасці забудоўшчыкаў, якія акумулююць грошы фізічных асоб, павінны прад'яўляцца самыя строгія патрабаванні. Цяпер далёка не заўсёды адбываецца менавіта так. У будаўніцтве, у тым ліку ў жыллёвым, атрымліваецца наступным чынам: сабраў грошы — і выкарыстоўваю, як хачу. Так быць не павінна», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

«Толькі тыя арганізацыі, якія пабудавалі не менш як 15 працэнтаў аб'екта (мінімум — цокаль, першы, другі паверхі), маюць права прыцягваць сродкі фізічных асоб для далейшага будаўніцтва жылля», — сказаў Прэзідэнт і запатрабаваў забяспечыць строгае выкананне гэтага правіла. Акрамя таго, Нацыянальны банк павінен забяспечыць асаблівы рэжым рахункаў, на якіх накопліваюцца такія сродкі, і абавязкова кантраляваць іх мэтавае выкарыстанне. «Каб усе грошы ішлі менавіта туды, куды яны прызначаліся, — на будаўніцтва жылля. І бралася грошай з грамадзян менавіта столькі, колькі трэба для рытмічнага будаўніцтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да старшыні Вярхоўнага Суда, Прэзідэнт даручыў наладзіць работу судоў такім чынам, каб яны неадкладна рэагавалі на заявы грамадзян наконт няякаснага і пратэрмінаванага будаўніцтва.

## Рэфармаваць з розумам

Паводле слоў Прэзідэнта, апошнім часам усё часцей гучаць прапановы адрадзіць Дзяржбуд, каб выключыць дубліраванне і няўзгодненасць дзеянняў розных дзяржаўных органаў, якія ў той ці іншай ступені займаюцца рэгуляваннем будаўнічых працэсаў. «Я ўжо гаварыў, што сёння варта завязаць на Мінбудархітэктуры ўзгадненне ўсёй нарматыўнай базы ў сферы будаўніцтва. Прычым такім чынам, каб без іх ведама ніводны дакумент, рэгламентуючы будаўніцтва, не быў прыняты. Толькі пасля ўзгаднення з Мінбудархітэктуры, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але спяшацца з пераўтварэннямі і здымаць з міністэрства адказнасць за падведамныя арганізацыі я не спяшаўся б. Усё павінна наспець. Скажу шчыра: я не прыхільнік радыкальных рэформаў на скорую руку».

«Калі будзеце фарміраваць будаўнічыя холдынгі, рыхтаваць прапановы аб перадачы ў камунальную ўласнасць падведамных арганізацый, то рабіце гэта акуратна. Штучнага аб'яднання і насілля быць не павінна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прэм'ер-міністра і губернатараў.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што апошнім часам на ўзроўні ўрада ўсё часцей узнікае жаданне перадаць многія суб'екты гаспадарання ў веданне мясцовых органаў улады. «А тыя ўсё бяруць. Думаюць, што справяцца. Вы што, не бачыце, што яны на месцах дом не могуць узгадніць і пабудаваць, а вы ім хочаце аддаць у кіраванне вялікія трэсты? Вы думайце, перш чым гэтыя рэформы праводзіць», — заўважыў Прэзідэнт.

Галоўнае, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, нельга забываць пра людзей, якія і ў спёку, і ў холад працуюць на будоўлях, паколькі іх работа адказная і вельмі цяжкая.

## Аб кошце метра

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што кошт квадратнага метра жылля па дзяржзаказе ў 2014 годзе будзе роўны сярэднямесячнай зарплаце па краіне. Ён нагадаў, што новае будаўніцтва жылля для грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў і аднаразовых субсідый на будаўніцтва або набыццё жылых памяшканняў, будзе ажыццяўляцца толькі па дзяржаўным заказе.

Паводле планаў урада, з 2,5 млн кв.м жылля, якое павінна быць уведзена ў 2014 годзе з дзяржпадтрымкай, па дзяржзаказе будзе пабудавана каля трэці — 800 тыс.кв.м. Кошт 1 кв.м такога жылля ў 2014 годзе будзе роўны сярэднямесячнай зарплаце па краіне з невялікай папраўкай на дату ўводу жылля ў эксплуатацыю ў адпаведнасці з нарматыўным тэрмінам будаўніцтва.

«Увядзенне дзяржзаказу на будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай павінна прынцыпова выключыць выпадкі з'яўлення праблемных дамоў у гэтым сегменце жыллёвага будаўніцтва, — лічыць Прэзідэнт. — А людзі будуць пазбаўлены ад валакіты — абіваць парогі розных інстанцый. Гатовае жыллё будуць выкупляць па зразумелых цэнах, разлічваць свае расходы з улікам тых ільгот і прэферэнцый, абавязацельстваў дзяржавы, якія належаць ім па законе».

Прэзідэнт даручыў ураду ў бліжэйшы час падрыхтаваць адпаведныя дакументы, каб з новага года сістэма пачала працаваць.

## Не згубіць дасягнутае

«Дзейнасць дзяржапарату павінна быць абсалютна празрыстай для грамадства», — заявіў Прэзідэнт падчас другой часткі рэспубліканскай нарады. «Ніякіх закрытых для крытыкі тэм у рабоце дзяржапарату няма і быць не павінна. Інакш у краіне абавязкова наступіць застой», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Прэзідэнт заўважыў, што крытыка павінна быць канструктыўнай і не ператварацца ў беспадстаўнае крытыканства. «Такое стаўленне да людзей, якія сумленна служаць дзяржаве, недапушчальна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што ў гады перабудовы была разгорнута «кампанія па шальмаванні партыйных і савецкіх работнікаў», водгалас якой дагэтуль адчуваецца на ўспрыманні дзяржслужачых у грамадстве. «Я не хачу ідэалізаваць усіх савецкіх чыноўнікаў — сярод іх сустракаліся розныя людзі, але ўсё ж такі прыстойных работнікаў, сапраўдных прафесіяналаў, якія стварылі вялікую краіну, было значна больш. Нельга стрыгчы ўсіх пад адзін грабянец», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Вельмі важна не згубіць тое, што Беларусі ўдалося стварыць за гады сваёй незалежнасці, не згубіць тую дзяржаву, якой мы можам ганарыцца».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Кадравая арыфметыка

# КРАІНЕ ПАТРАБУЮЦЦА ІНЖЫНЕРЫ, ТЭХНОЛАГІ, АГРАНОМЫ

## ...але іх падрыхтоўка не выгадная для ВНУ

**«Пры планаванні кантрольных лічбаў прыёму кіраўнікі ўстаноў адукацыі павінны адысці ад карысных інтарэсаў (зарабіць пабольш грошай на прэстыжных спецыяльнасцях) і кіравацца інтарэсамі дзяржавы. Прэстыжнымі павінны стаць тыя спецыяльнасці, якія патрабуюцца эканоміцы і дзе чакаюць маладых спецыялістаў», — заявіў першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК на калегіі свайго ведамства, прысвечанай удасканаленню аб'ёмаў і структуры падрыхтоўкі кадраў ва ўстановах прафесійнай адукацыі.**

Пры размеркаванні лічбаў прыёму на ўсіх узроўнях прафесійнай адукацыі ў 2014 годзе будуць улічвацца чатыры асноўныя параметры: прапановы работадаўцаў у выглядзе дагавораў і заявак на падрыхтоўку спецыялістаў і рабочых (служачых), вынікі размеркавання папярэдніх гадоў, паказчык беспрацоўя на рынку працы і дэмаграфічная сітуацыя.

Асноўны прынцып наступны: калі тыя ці іншыя галіны — транспарт, сувязь, культура, медыцына, сельская гаспадарка і г.д. — у рэгіёне з'яўляюцца прыярытэтнымі кірункамі развіцця, то ВНУ, якія рыхтуюць для іх кадры, павінны гарантавана атрымаць бюджэтныя месцы ў аб'ёме, неабходным для кадравага забеспячэння. Акрамя таго, з 2014 года ў шэрагу ўстаноў адукацыі будзе спынены прыём за кошт сродкаў бюджэту на эканамічныя і юрыдычныя спецыяльнасці. Больш за тое, цяпер кантроль будзе весціся за размеркаваннем паміж запатрабаванымі спецыяльнасцямі не толькі бюджэтных, але і платных месцаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Прафарыентацыя ці дзень адкрытых дзвярэй?

— Статыстыка сведчыць, што да 2016 года колькасць выпускнікоў базавай і агульнаадукацыйнай школ у суме будзе нязменнай — на ўзроўні 145 тысяч чалавек. Тэндэнцыя змяншэння колькасці выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы захаваецца да 2015 года. Сёлета патокі выпускнікоў 11-х класаў размеркаваліся наступным чынам: 55% з іх паступілі ў ВНУ, 25% — пайшлі навучацца ў сярэднія спецыяльныя ўстановы адукацыі і толькі 17% атрымліваюць прафесійна-тэхнічную адукацыю. Між тым, 80% вакансій на рынку працы складаюць менавіта рабочыя прафесіі.

Аляксандр Жук падкрэсліў, што дзякуючы ўвядзенню ніжняга парога на цэнтралізаваным тэсціраванні адбылося пераразмеркаванне патокаў абітурыентаў. Так, за апошнія тры гады прыём у ВНУ скараціўся больш чым на трэць (або на 34,5 тысячы чалавек). У гэтым годзе ў ВНУ было залічана на 6% менш выпускнікоў, чым летась. Паказчык паступлення адзінаццацікласнікаў у прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы павялічыўся на 1%, а ў сярэднія спецыяльныя ўстановы — больш чым на 3% у параўнанні з папярэднім годам.

Разам з тым, аналіз уступнай кампаніі 2013 года выявіў шэраг праблем. Па-першае, меў месца істотны недабор абітурыентаў у шэрагу ўстаноў адукацыі. На ўзроўні вышэйшай адукацыі вакантнымі засталіся 2,4 тысячы бюджэтных месцаў, што ў пяць разоў больш за паказчык папярэдняга года. Поўнасцю план прыёму выканалі толькі 16 дзяржаўных ВНУ, у тым ліку ўсе чатыры медуніверсітэты, і не выканала ні адна прыватная ВНУ. Праблемы з укамплектаваннем бюджэтных месцаўназіраліся і па асобных, надзвычай запатрабаваных наймальнікамі спецыяльнасцях, дзе патрабуецца веданне матэматыкі, фізікі, хіміі. Гэта так званыя вострадэфіцытныя спецыяльнасці, але ў абітурыентаў яны попытам не карыстаюцца. У аўтсайдарах аказаліся сельскагаспадарчыя спецыяльнасці (325 вакантных месцаў); педагагічныя спецыяльнасці (296 вакантных месцаў, з іх 184 — фізіка-матэматычнага профілю); ваенныя спецыяльнасці (195 месцаў), спецыяльнасці для металургічнай вытворчасці, лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі, лёгкай і хімічнай прамысловасці.

Большасць ВНУ апраўдвае свой недабор павышэннем ніжняга парога тэставых балаў. Але ў Міністэрстве адукацыі бачаць яшчэ і іншую прычыну — адсутнасць эфектыўнай прафарыентацыйнай работы і ўзаемадзеяння з наймальнікамі.

— У ВНУ, дзе прафарыентацыйная работа не абмяжоўваецца днём адкрытых дзвярэй, дзе кіраўнікі бачаць перспектывы развіцця сваёй установы, вырашаюцца і праблемы з наборам. Інакш як можна патлумачыць, што такая сумная сітуацыя з наборам назіралася не ва ўсіх аднапрофільных і роднасных ВНУ, — звярнуўся да рэктараў Аляксандр Жук. — Так, Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту і Віцебскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту ўдалося ўкамплектаваць нават педагагічныя спецыяльнасці фізіка-матэматычнага профілю. Запоўнілі ўсе бюджэтныя месцы Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. А Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія па тых жа спецыяльнасцях не закрыла 250 бюджэтных месцаў (выканаўшы план прыёму толькі на 64%).

**Сёлета ў аўтсайдарах аказаліся сельскагаспадарчыя, педагагічныя, ваенныя спецыяльнасці, спецыяльнасці для металургічнай вытворчасці, лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі, лёгкай і хімічнай прамысловасці.**

### Фіяска прыватных ВНУ

Яшчэ адна праблема — высокі працэнт абітурыентаў, залічаных у ВНУ на завочную форму навучання, асабліва ў прыватных ВНУ. Калі ў дзяржаўных ВНУ доля прыёму на завочную форму складае менш за палову залічаных, то ў прыватных ВНУ назіраецца зусім іншая сітуацыя. У абсалютных лічбах колькасць залічаных абітурыентаў на завочную форму навучання ў прыватныя ВНУ за тры гады скарацілася на 40% (або на 5,2 тысячы чалавек), аднак з улікам невыканання плана прыёму на дзённую форму навучання (а сёлета недабор склаў 7,3 тысячы чалавек, або 85%), удзельная вага залічаных на завочную форму навучання вырасла да 73%.

— Я нічога не маю супраць прыватнага сектара вышэйшай школы, паколькі большасць вядучых універсітэтаў свету — недзяржаўныя, але базавыя арыенціры многіх нашых прыватных ВНУ відавочна не дацягваюць да канкурэнтаздольнага ўзроўню. Яны занялі нішу найменш затратных спецыяльнасцяў выключна з тэарэтычнай падрыхтоўкай («Права» і «Эканоміка»). Прычым, як правіла, упор робіцца не столькі на дзённую, колькі на менш дарагую, завочную, форму. Дайшло да таго, што выпуск завочнікаў стаў перавышаць выпуск спецыялістаў, якія атрымалі паўнавартасную вочную адукацыю. Захаванне такой тэндэнцыі вельмі небяспечнае, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва, напрыклад, залічыў летась на дзённую форму навучання 73 чалавекі, а ў гэтым годзе — увогуле 19 чалавек. Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва — летась 57 чалавек і 22 чалавекі ў гэтым годзе, Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці — 97 і 41 чалавека адпаведна. Хацелася б пачуць ад рэктараў прыватных ВНУ, як яны бачаць перспектывы далейшага развіцця сваіх навучальных устаноў? Мяркую, прыйшоў час перагледзець у ліцэнзіях на права ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці суадносіны гранічнай колькасці навучэнцаў на дзённай і завочнай форме атрымання адукацыі. Тым больш што ў большасці ВНУ дзеянне ліцэнзій завяршаецца вясной 2014 года. Колькасць тых, хто навучаецца на завочнай форме, не можа перавышаць колькасць тых, хто навучаецца на дзённым аддзяленні.

**Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва залічыў на дзённую форму навучання 19 чалавек, прыватны Інстытут кіравання і прадпрымальніцтва — 22 чалавек, Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці — 41 чалавека.**

### «Апетыты» і рэчаіснасць

Сёння патрабуецца структурная перабудова аб'ёмаў падрыхтоўкі студэнтаў і ўстараненне дысбалансу незапатрабаваных і дэфіцытных прафесій: краіне патрэбны інжынеры, аграномы, урачы, а таксама спецыялісты прыродазнаўча-навуковага профілю.

Разам з тым, у шэрагу ВНУ аб'ёмы падрыхтоўкі па спецыяльнасцях, якія з'яўляюцца няпрофільнымі для гэтых устаноў адукацыі, застаюцца даволі вялікімі. Так, на спецыяльнасці эканамічнага і юрыдычнага профіляў у Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію сёлета залічаны 23% першакурснікаў (151 чалавек), у Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт — 17% (95 чалавек). (Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (адзіная ВНУ краіны, якая рыхтуе кадры для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці) у 2013 годзе па выніках залічэння першакурснікаў мае 41% (155 чалавек) «эканамістаў і фінансістаў» і толькі 23% (89 чалавек) дызайнераў і трэць (137 чалавек) будучых інжынераў-тэхнолагаў у сферы лёгкай прамысловасці. А ў прыватных ВНУ аб'ёмы падрыхтоўкі па згаданых спецыяльнасцях перавышаюць 85% ад прыёму.

Нягледзячы на ўсе спробы Міністэрства адукацыі скарэктаваць лічбы прыёму на платнай аснове, агульны план прыёму на платную форму навучання склаў 67,2 тысячы чалавек, што ўдвая перавысіла фактычную колькасць прыёму: на платную форму навучання ў 2013 годзе былі залічаны 33,6 тысячы чалавек. Многія ВНУ ўстанавілі максімальна магчымую планку прыёму, асабліва прыватныя ВНУ.

Складваецца ўражанне, што многія кіраўнікі адарваны ад рэчаіснасці і зусім не здольны ацэньваць рэальную сітуацыю. Так, Мінскі інстытут кіравання зацвердзіў план прыёму ў 7,6 тысячы чалавек, што ў 5 разоў перавышала лічбы фактычнага прыёму ў 2012 годзе, з іх 3,8 тысячы першакурснікаў планавалі прыняць на дзённую форму навучання (у 19 разоў больш!) А што ў выніку атрымалі? На дзённую форму навучання былі залічаны толькі 196 чалавек.

Дыспрапорцыя ў колькасці залічаных абітурыентаў і заяўленай колькасці платных месцаў назіралася і ў дзяржаўных ВНУ. БДТУ: план — 950, а па факце — 182. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт: план — 1750, па факце — 380. БНТУ: план — 1912, па факце 926. БДПУ імя М.Танка: план — 1010, па факце — 487.

Аляксандр Жук паведаміў, што ў праект правілаў прыёму ў ВНУ ў новай рэдакцыі ўнесена норма па абавязковым узгадненні лічбаў прыёму на платнай аснове з Мінадукацыі.

### Стаўка — на мэтавую падрыхтоўку

За апошнія тры гады на навучанне на ўзроўні вышэйшай адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі было залічана больш як 5 тысяч чалавек: з іх 1832 — на спецыяльнасці медыцынскага профілю, 1435 — на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю і 1533 — на педагагічныя спецыяльнасці. На ўсе іншыя профілі — значна менш.

Па прапанове шэрагу міністэрстваў у праекце новых правілаў прыёму прадугледжваецца магчымасць ажыццяўляць мэтавую падрыхтоўку па ўсіх спецыяльнасцях. Заключаць дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы з абітурыентамі заказчыкі кадраў змогуць незалежна ад месца іх пражывання і адзнак па прадметах уступных выпрабаванняў у іх дакуменце аб адукацыі. Мэтавы набор па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях плануецца павялічыць да 60% ад кантрольных лічбаў прыёму, а па іншых спецыяльнасцях — да 40%. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах мэтавы набор па сельскагаспадарчых і медыцынскіх спецыяльнасцях павялічаць да 60%, а па іншых спецыяльнасцях — да 30%.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# «ШЧАСЦЕ — НЕ МЕСЦА, КУДЫ МОЖНА ПРЫЙСЦІ»



**Настойлівасць** у дасягненні мэты мне дапамагаў развіваць былы губернатар Гродзенскай вобласці Сямён Шапіра. Часам паказваў, як гэта робіць іншыя. Запрашаў разам з кіраўнікамі розных прадпрыемстваў і работнікамі аблвыканкама на хакейныя матчы. «Хварэлі», ведома, за гродзенскую каманду «Нёман» і вельмі радаваліся, калі нашы перамагалі. Ды я і сама, калі шчыра, не люблю праіграваць.

**Раней лічыла,** што для публічнага чалавека галоўнае — дух, душа і духоўнасць. І менавіта гэта развівала ў сабе. Цяпер жа адчула, што ўласнае здароўе — не асабістая справа палітыка, а грамадскі рэсурс.

**Паважаю** Вадзіма Дзевятоўскага не толькі як алімпійскага чэмпіёна і свайго калегу-дэпутата, але і як вельмі крэатыўнага чалавека. Аднойчы мы з ім удзельнічалі ў радыёпраграме, якая ішла ў прамым эфіры. Потым Вадзім запрасіў папіць кавы. За кавай ён мне прызнаўся, што піша вершы. У кожным з іх — глыбокія перажыванні. У Вадзіма ёсць нават верш пра журналіста, дакладней, пра свае ўражанні ад інтэрв'ю. Цікава, што не толькі мае былыя калегі пішуць пра вядомага спартсмена, але і ён — пра іх. У сваім парламенцкім жыцці я сустрэла і іншых вельмі яркіх і разумных людзей. Надзейных, якія ўмеюць падставіць плячо.

## Пра нямецкую мову, знакамітасць і сына Васіля Быкава

**У дзяцінстве** пра журналістыку я не марыла. Вельмі хацела быць перакладчыцай. У школе настаўнікам нямецкай мовы ў нас быў дырэктар Аляксандр Пятровіч Шчурскі. Час ад часу яго тэрмінова выклікалі, і ён прасіў мяне працягнуць урок. Я гэта рабіла з задавальненнем. Але перад паступленнем даведалася, што ў Маскоўскім інстытуце замежных моў на перакладчыцкі факультэт набіраюць толькі хлопцаў...

**Аднойчы тата прапанаваў** мне ісці вучыцца на журналіста. Можа, пажартаваў тады, а можа, нешта і прадбачыў, калі сказаў: «Будзеш знакамітай!». Гэтым мяне і купіў *(смяецца)*.

**Рэдактарам «Гродзенскай праўды»** я стала ў крызісны для газеты час. Калектыў вельмі хацеў перамен, але спачатку мы з цяжкасцю знаходзілі паразуменне. І тады я падумала: трэба даведацца, што адбывалася тут да мяне. Пачала гартаць газетныя падшыўкі і ўбачыла ўсё: і прычыну праблем, і шмат яркіх старонак. Так, у «Гродзенскай праўдзе» пачыналі свой творчы шлях многія знакамітыя журналісты і пісьменнікі, у тым ліку Васіль Быкаў, Алесь Карпюк, Міхась Васілёк, Андрэй Колас, Аляксандр Чарняк, Аляксандр Акулік... У кабінетах і падвале мы знайшлі цікавыя рэчы: сцяг, даваенныя працоўныя кніжкі і пасведчанні, унікальныя чорна-белыя фотаздымкі, дзённікі. І тады я зразумела, што трэба стварыць у Гродне музей журналістыкі, інакш усё з часам згубіцца.

**Сын Васіля Быкава,** таксама Васіль, даведаўся пра музей і падарыў нам бацькаву ручку. Хто ведае, магчыма, менавіта ёй аўтар «Сотнікава», калі працаваў у рэдакцыі, не шкадуючы, падпісваў паштоўкі ды кнігі, якія перадалі музею былыя супрацоўнікі газеты. А старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец аддаў рэдакцыі аб'ёмную папку копій перапіскі з Васілём Быкавым. Сярод цікавых экспанатаў — і ліст Алесю Карпюку ад Валянціны Цярашковай.

**Не ацэньваю фемінізацыю** нашай прафесіі як адмоўны факт. Бо, калі я працавала рэдактарам «Гродзенскай праўды», у газеце быў пераважна жаночы калектыў. Жанчыны — усе, як адна, не толькі таленавітыя, але і адказныя. Яны ні разу мяне не падвялі. Магчыма, таму, што я нічога не прымушала іх рабіць супраць волі. Бо па сабе ведаю, што пад прымусам дрэнна справа робіцца. А вось калі папросяць і я адчую, што лепш за мяне ніхто гэта не зробіць, то зусім іншая справа...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Пра сатаністаў, трох прэзідэнтаў і гуляючага «трэнера»

**Журналіст** — прафесія, звязаная з рызыкай. У тыя гады, калі я толькі пачынала працаваць, у сярэднім у свеце працягласць жыцця журналіста складала 45 гадоў. Праца ў «гарачых кропках», пастаянныя стрэсы. Але і сёння ў нашай прафесіі без стрэсу не абыходзіцца.

**Аднойчы пісала** пра сатаністаў, якія пераварочвалі і ламалі крыжы на могілках. Начальнік крымінальнага вышуку быў маім сябрам і дазволіў папрысутнічаць на допыце. У той дзень, калі выйшаў артыкул, сатаністы прыйшлі ў рэдакцыю «разбірацца». Аказалася, што адзін з іх жыў са мной у суседнім доме. А ў мяне якраз было маленькае дзіця... Пасля журналісцкага расследавання «Уваходзячы ў царкву, здымаюць капялюш, а не галаву», кіраўнікі дзвюх дэструктыўных сектаў пераўтварылі маё жыццё ў кашмар. А пасля артыкула «Гестапа ў гасцініцы» настойліва прапаноўвалі «пагаварыць» прадстаўнікі бандыцкай групоўкі. Я была смелым журналістам. Цяпер, калі стала выкладаць у інстытуце журналістыкі БДУ, разумею, што маладым журналістам трэба прывіваць псіхаэмацыянальную ўстойлівасць.

**Мая дачка** працуе ў Маскве на тэлеканале Саюзнай дзяржавы. Не паспела яна туды ўладкавацца, як яе акрэдытавалі на сустрэчу, у якой удзельнічалі адразу тры прэзідэнты — Беларусі, Расіі і Казахстана. У самы адказны момант у камеры выйшла са строю гукавая дарожка, таму прыйшлося пісаць усё на дыктафон. Вось вам яшчэ адна стрэсавая сітуацыя.

**Калі газета будзе** салодкай, як цукерка, або зусім не будзе мець смаку, людзі перастануць яе чытаць. Таму я — за крытыку. Але не за крытыку дзеля крытыкі, а абгрунтаваную. Я была не проста рэдактарам, а гуляючым «трэнерам». Самыя складаная крытычныя матэрыялы брала заўсёды на сябе. Старалася ўказваць мясцовай уладзе на вузкія месцы. Але мая крытыка заўсёды была праверанай. З аднаго раёна да нас прыходзілі скарга за скаргай. Я з'ездзіла на месца, пераканалася, што яны небеспадстаўныя. Неўзабаве выйшаў артыкул, які я скончыла прыблізна так: «Калі становішча не зменіцца, не выключаю, што ў вышэйшым эшалоне ўлады раёна могуць быць кадравыя змены». У хуткім часе так і адбылося.

## Пра матушку Гаўрыілу, здраду і надзейныя рукі

*Наша гутарка працягнулася ў кабінеце. «Гарбаты? Кавы?» — цікавіцца Алена Пятроўна. ...Праз некалькі хвілін мы ўладкоўваемся на мяккай канапе і разглядаем фотаздымкі з жыцця «да парламента». «Вось тут я ў Палацы Рэспублікі атрымліваю чарговую «Залатую літару». А вось Мітрапаліт Філарэт уручае мне медаль Святой Прападобнай Еўфрасінні Полацкай...»*

**Вельмі люблю** прыходзіць у Свята-Раства-Багародзічны жаночы манастыр у Гродне. Ён знаходзіцца ў самым цэнтры горада. Якая там цішыня! Першым на гэта звярнуў увагу былы губернатар Аляксандр Іосіфавіч Дубко. Ён прыходзіў туды гэтай самай цішынёй... дыхаць.

**Асабліва цёплае, даверлівае стаўленне** ў мяне да ігумені Гаўрыілы. Матушка летась атрымала прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». У той час, калі яна выходзіла на сцэну, апошнія гадзіны дажывала яе ўласная матуля. Я ведала аб гэтым і была побач з ігуменняй. Ведаю, матушка зрабіла б тое ж самае: калі на сэрцы цяжка, яна запрашае да сябе. Заварвае незвычайна смачную гарбату, і мы разважляем. Такія хвіліны, паверце, дарагога каштуюць.



**Я вельмі рада,** што разам з матушкай Гаўрыілай і актывісткамі Беларускага саюза жанчын Надзеяй Ермаковай і Марыяй Біруковай была ў ліку тых, хто адраджаў у Беларусі сямейнае свята — свята Пятра і Фяўронні. Прыгожая гісторыя кахання мурамскага князя і сялянкі, якія пражылі шчаслівае жыццё і памерлі ў адзін дзень, можа стаць узорам для пераймання парам, якія плануюць пабрацца шлюбам. Сапраўднае каханне не можа быць эгаістычным, сапраўднае каханне — ахвярнае. А ўзаемная вернасць мужа і жонкі — паняцце святое. Тут варта прыгадаць эпізод з легенды, калі Пётр і Фяўроння плылі па рацэ. А ў суседняй лодцы мужчына, хоць побач з ім сядзела яго жонка, пачаў заглядвацца на княгіню. Фяўроння вырашыла яго правучыць і кажа: «Зачарпні вады з левага боку лодкі і з правага — і адпі. Ці аднолькавая вада?» — «Аднолькавая, спадарыня.» — «Вось і жаночая існасць аднолькавая». Так проста і даступна Фяўроння растлумачыла непатрэбнасць і бязглуздасць здрады.

**Муж мой таксама,** як і я, усё жыццё будаваў сваю кар'еру. Таму ў гэтым плане ў нас узаемапаразуменне. Праўда, гэта цяпер прасцей. А раней, калі дачка была маленькая, без бацькоў мы наўрад ці справіліся б. Яны заўсёды нам дапамагалі. У дэкрэтным водпуску я была ўсяго 1,5 года. Затым аддала дачку ў садок. Там працавала мая мама, таму я ведала, што дачка ў надзейных руках. Мама і зараз імкнецца мяне апякаць. Хоць я ўжо дарослая цётачка *(усміхаецца)*. Але я цаню гэты клопат і стараюся не хваляваць бацькоў, бо разумею, што мы застаёмся дзецьмі, пакуль жывыя нашы бацькі.



## Пра Бетховена, джынсы і «крутую» масквічку

**У музычнай школе** я любіла іграць Бетховена «Да Элізы». Дзесяцісекундны ўрывак з гэтага твора падчас пленарных пасяджэнняў гучыць у Авальнай зале. Пад гэтую музыку ідзе галасаванне.

**Працоўная кніжка** ў мяне з'явілася ў 16 гадоў. Я скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, і мама ўладкавала мяне папрацаваць летам музычным кіраўніком у вясковы дзіцячы садок. Мне там так спадабалася, што я ўмудралася сумяшчаць працу з вучобай у дзясятым класе. Школу я скончыла з залатым медалём. Пра тое, што я адначасова вучуся і працую, мае настаўнікі нават і не здагадваліся.

**Апошнім часам я палюбіла** адзіноту. Калі разумееш, што ты цікавы сабе, зусім не цяжка пабыць сам-насам са сваімі думкамі. Калі адчуваю лёгкае засмучэнне, іду туды, дзе шмат людзей (у тэатр, на выставу), гуляю па Мінску, часам заходжу ў якую-небудзь краму і штосьці набываю.

**Ёсць некалькі месцаў,** дзе я набываю адзенне. Там ведаюць мой густ, прапаноўваюць тое, што мне трэба. І я не губляю час упустую. Раней, калі жыла ў Гродне, у мяне нават быў свой стыліст. Сёння ж маім іміджам займаецца мой памочнік Надзея Сакалова. Яна шмат гадоў працавала на тэлебачанні і падказвае, як правільна зрабіць, каб спалучаліся і душа, і думкі, і адзенне.

**Імкненне добра выглядаць** — гэта ў мяне з дзяцінства. Я, нягледзячы на ўзрост, люблю моладзевы стыль. Але праца ў парламенце патрабуе выключна дзелавога. Джынсавыя касцюмы і лёгкія сукенкі я нашу ў паўсядзённым жыцці, каб не адрозніваюцца ад іншых людзей. Гэта, да слова, мой галоўны прынцып.

**Карыстаюся грамадскім транспартам** і ніколі не набываю квіткі ў дэпутацкай касе. Аднойчы са мной у цягніку ехала «крутая» масквічка. Калі яна набывала каву, правадніца неяк да слова сказала, хто я. Адносіны жанчыны да мяне сталі падкрэслена ветлівымі... А мне так хацелася працягнуць цікавую гутарку, якая часам завязваецца паміж выпадковымі спадарожнікамі.

## Пра псіхалагічна старых, брытанскага афіцэра і манну нябесную

**Жыццё** — гэта займальнае падарожжа. Калі ў чалавека няма мары, мэты, планаў, калі ён сёння робіць так, як рабіў учора, і гэта яго цалкам задавальняе, — ён ператвараецца ў псіхалагічна старога. І ніхто яму не можа дапамагчы, акрамя яго самога.

**Графа «ваеннаабавязаная»** дапамагла мне патрапіць на НАТАўскую інспекцыю айчыннай авіябазы. Стала ваеннаабавязанай дзякуючы вучобе на ваеннай кафедры ва ўніверсітэце. Акрэдытацыю мне зрабіў камандзір вайсковай часці, які мяне паважаў як журналіста. Тады ўпершыню ўбачыла грозную баявую зброю, трапіла ў кабіну баявога МІГа і ўзяла інтэрв'ю ў маёра ВПС Вялікабрытаніі. У той дзень на мяне звярнулі ўвагу ўсе, бо на аэрадроме я была адзінай жанчынай. Маю ж увагу зачапіў брытанскі афіцэр, які стаяў на вышцы непадалёку і назіраў за авіяшоу. Лётчык выглядаў вельмі напружаным і пазней прызнаўся, што не хацеў бы сустрэцца ў баі ні з такімі самалётамі, ні з беларускімі асамі, якія былі за штурваламі. Няхай будзе мір ва ўсім свеце, падумалі і я, і ён...

**Шчасце** — не месца, куды можна прыйсці. Калі б гэта было так, то людзі не супакоіліся б, пакуль не выпыталі адно ў аднаго, дзе яно знаходзіцца. Шчасце — гэта стан, які не трэба чакаць як манны нябеснай. Да яго трэба імкнуцца, шукаць у сабе, пастарацца ствараць, адкрываць. Яно абавязкова здараецца, калі проста робіш добрыя справы і пры гэтым не чакаеш нічога ўзамен.

**Асабістымі марамі дзяліцца** не буду. Бо, як кажуць, хочаш рассмяшыць Бога — раскажы яму аб сваіх планах. А вось грамадска значнымі — іншая справа. Зараз шукаю інвестараў для рэалізацыі праекта аднаўлення гістарычнага цэнтра Гродна, праводжу дабрачынныя акцыі ў сваёй акрузе, працую над выкананнем сваіх передвыбарных абяцанняў. На гэта накіравана ўся мая энергія.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**




### Надвор'е

## ПАЦЯПЛЕЕ І ДОЖДЖ

**У сераду на тэрыторыю Беларусі завітае атмасферны фронт з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Таму будзе ісці мокры снег, які потым пяройдзе ў дождж. Месцамі прагназуецца галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ў ноч на сераду будзе ад мінус 3 на захадзе, да мінус 15 градусаў па паўднёвым усходзе. А вось удзень стане цяплей, бо прагназуецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. У чацвер і пятніцу пад уплывам цёплых паветраных мас Атлантыкі ў асобных раёнах краіны пройдуць невялікія ападкі (мокры снег і дождж). Чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя зноў стане халадней. Месцамі кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ў суботу — ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Снежаньскі крыгаход на Заходняй Дзвіне.

Фота БЕЛТА.

### Добрая справа

## У КОЖНАГА ДЗІЦЯЦІ БУДЗЕ СВЯТА

**Падчас навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» плануецца наведаць не менш за 257 дзіцячых сацыяльных устаноў па ўсёй краіне. Дзякуючы гэтаму падарункі змогуць атрымаць каля 15 тысяч дзяцей. Пра гэта паведамілі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі падчас прэс-канферэнцыі.**

Акцыя пройдзе з 11 снежня па 10 студзеня, удзел у ёй пацвердзілі ўжо 85 арганізацый. Але намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык заўважыў, што іх колькасць павялічыцца. Плануецца, што, як і летась, да мерапрыемства далучацца ўсе дзяржаўныя міністэрствы і ведамствы, грамадскія аб'яднанні, банкі, прыватныя кампаніі і грамадзяне. Падчас акцыі прадстаўнікі арганізацый наведаюць дзіцячыя дамы (у тым ліку сямейнага тыпу), бальніцы, інтэрнаты і іншыя сацыяльныя ўстановы і акажуць ім адрасную дапамогу.

Цэнтральнай падзеяй акцыі традыцыйна стане навагодняе свята «Галоўная ёлка краіны» з удзелам кіраўніка дзяржавы, якое пройдзе 27 снежня ў Палацы Рэспублікі. На яго будуць запрошаны дзеці-сіроты з усіх рэгіёнаў краіны, апроч таго — гадаванцы кадэцкіх вучылішчаў, вучні-пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, спартыўных спаборніцтваў, а таксама навучэнцы, якія дасягнулі поспеху ў грамадскай рабоце.

Прадстаўнікі Мінадукацыі адзначылі, што і дзеці, якія знаходзяцца ў спецустановах, таксама атрымаюць віншаванні. «У межах акцыі важна дайсці да кожнага дзіцяці», — падкрэсліла **кансультант упраўлення сацыяльна-выхаваўчай і ідэалагічнай работы Мінадукацыі Алена ГАЛАЎНЁВА.** Па яе словах, цяпер на ўліку знаходзіцца больш за 20 тысяч непаўналетніх. «Гэта не паказчык праблемнасці, а паказчык таго, што менавіта гэтым дзецям сёння неабходна асаблівая ўвага».

Рэспубліканская навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» сёлета будзе ладзіцца ўжо 19-ты раз.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

### У чаканні Каляд

## «ДАЙЦЕ, НЯБЁСЫ, РОСАЎ З ВЫШЫНІ»



## Каталікі ўсяго свету перажываюць Адвент, час падрыхтоўкі да свята Божага Нараджэння

**У мінскім кафедральным касцёле ў гонар Найсвяцейшай Панны Дзевы Марыі халаднавата, ціха, цёмна, і толькі святло залацістых ліхтарыкаў у руках вернікаў разбурае сцяну цемрыва... Тут адбываюцца раraты — адмысловыя зімовыя набажэнствы, назва якіх паходзіць ад лацінскага літургічнага спеву «Rorate coeli desuper» («Дайце, нябёсы, росаў з вышыняў»).**

— Раратнія імшы ў гонар Маці Божай — адна з самых прыгожых традыцый Адвенту. Сэнс гэтых набажэнстваў у тым, што яны пачынаюцца да ўзыходу сонца, — тлумачыць «Звяздзе» асаблівасці раратаў **клерык Раман СТРАШКО (на фота)**. — У касцёл людзі прыходзяць з запаленымі свечкамі, ліхтарыкамі, лампадкамі, што сімвалізуе святло Хрыста. Ліхтарыкі, якія разам з дзецьмі вырабляюць дарослыя, дапамагаюць асвятліць змрок у сэрцах і душах. І толькі падчас выканання гімна «Хвала на вышынях Богу...» у храме запальваецца святло...

У мінскай катэдры рараты адбываюцца па аўторках і чацвяргах у 6:45. А таму, каб трапіць на набажэнствы, вернікі прачынаюцца ледзь не а 5 гадзіне раніцы. Раман Страшко, ураджэнец Нясвіжа, узгадвае, як цяжка ў дзяцінстве самому было зарана прачынацца, а пасля ўжо прызвычаіўся і заводзіў сам сабе будзільнік.

— На рараты ў нашай парафіі была цікавая традыцыя, — кажа наш суразмоўца. — На адным баку кардонных сэрцайкаў мы пісалі добрыя ўчынкі, якія паспелі зрабіць за апошнія дні, на другім — імя і прозвішча. Пасля казані святар зачытваў адно з сэрцаў. І той, чыё імя было напісана на кардонцы, атрымліваў фігуру Маці Божай, каб мог дома памаліцца перад ёй да наступнай імшы.



Адвент, які доўжыцца амаль чатыры тыдні, сапраўды багаты на разнастайную сімволіку. Напрыклад, адвентавы вянок, які ўпершыню зрабіў для малітвы ў пазамінулым стагоддзі нямецкі пратэстанцкі пастар Ёхан Віхерн, ці такі папулярны на Захадзе перадкалядны каляндар, кожны дзень якога адзначаецца невялічкім падарункам. Праўда, як лічыць Раман Страшко, чалавек у адвентавым чаканні мусіць найперш сканцэнтравацца на ўнутранай, а не знешняй падрыхтоўцы.

— У гэтыя дні мы павінны задумацца аб сваім жыцці, над сваімі праблемамі і зрабіць пастанову на час Адвенту. Гэта не пост, а радаснае чаканне прыходу Збаўцы. Трэба імкнуцца зрабіць сябе лепшым, выправіць грахоўнасць, каб з чыстым сэрцам прыняць прыход Ісуса Хрыста.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ**

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ на І кв. або 1–е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон ________ ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
на І квартал
або 1-е паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе
ДА 11 СТУДЗЕНЯ
ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

СУПЕРПРЫЗ тэлевізар SAMSUNG

7 мультыварак SCARLET

Сярод падпісчыкаў 14.01.2014 г. будуць разыграны 7 мультыварак Scarlet і суперпрыз – тэлевізар Samsung. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да 24.01.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.03.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**
**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 14.11.13 г.**
**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 15.11.13 ПА 31.03.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2255 ад 30.10.13, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

# «НАВУКА МАЛАДЫХ...»


Вольга МАРАЗЕВІЧ.


Дзмітрый РУДАКОЎ.


Святлана АЛЕЙНІКАВА.


Ксенія РАЗУВАНАВА.


Андрэй ІВАНЕЦ.


Вольга КРУКОЎСКАЯ.


Аляксандр ШАШКО.


Таццяна ПЛІСКО.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**У гутарцы прынялі ўдзел: Андрэй ІВАНЕЦ, кандыдат хімічных навук, старшыня Савета маладых вучоных НАН Беларусі; Ксенія РАЗУВАНАВА, кандыдат гістарычных навук, Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі; Святлана АЛЕЙНІКАВА, кандыдат сацыялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь; Вольга МАРАЗЕВІЧ, кандыдат эканамічных навук, дацэнт, старшыня Савета маладых вучоных Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта; Дзмітрый РУДАКОЎ, кандыдат хімічных навук, Аддзяленне хіміі і навук аб Зямлі НАН Беларусі; Аляксандр ШАШКО, старшы выкладчык эканамічнага факультэта БДУ, намеснік старшыні Савета маладых вучоных; Вольга КРУКОЎСКАЯ, аспірант, кіраўнік працоўнай групы па навуковай дзейнасці Савета маладых вучоных НАН Беларусі; Таццяна ПЛІСКО, аспірант, Аддзяленне хіміі і навук аб Зямлі НАН Беларусі.**

## Якая яна — сучасная беларуская навука?

**А. Іванец:** — Ацаніць стан беларускай навукі сёння дазваляюць канкрэтныя статыстычныя звесткі па рэспубліцы, якія вядуцца не намі, а шматлікімі інстытутамі і арганізацыямі. Па колькасці навукоўцаў значную частку ўсёй беларускай навукі — крыху больш за 30% — складае Акадэмія навук.

**А. Шашко:** — У лістападзе была апублікавана такая інфармацыя (Global Innovation Index 2013), што Беларусь па развіцці навукі і навацый у свеце знаходзіцца на 77-й пазіцыі са 142 краін-удзельніц. Вядома, ёсць пытанні па складзе гэтага спіса. Прычым нам вядома, як гэта ўсё робіцца. Асобныя звесткі бяруцца з іншых рэйтынгаў; калі нас у іх няма, ставіцца прочырк. Па нашых ацэнках, калі замест гэтых прочыркаў паставіць рэальныя лічбы, то мы былі б на 50-х пазіцыях.

**В. Маразевіч:** — Стан айчыннай навукі вызначаюць яе навукоўцы. Многія беларускія вучоныя вядомыя ў свеце. Не толькі хімікі і фізікі, а і эканамісты, гісторыкі, прадстаўнікі тэхнічных навук. Іх кнігі і падручнікі перавыдаюцца, перакладаюцца на замежныя мовы, іх цытуюць. Але мне здаецца, не толькі індэкс цытавання трэба ўлічваць, кажучы аб развіцці навукі. Адна справа — выкарыстанне навуковых публікацый і абагульненняў у праўядзенні тэарэтычных даследаванняў і ў навучальным працэсе, іншая — у атрыманні практычнага выніку. Таму сёння перад беларускімі навукоўцамі стаіць задача: думаць крэатыўна, інтэнсіўна, а яшчэ і эфектыўна.

**А. Іванец:** — Сапраўды, у кожнай з вялікіх галін навуковых даследаванняў у нашай краіне ёсць імёны, агульнапрызнаныя і вядомыя ў свеце. Але магу запэўніць, што многія з іх працуюць разам з еўрапейскімі і амерыканскімі даследчыкамі. А гэта гаворыць аб прызнанні беларускай навукі ў свеце.

**К. Разуванава:** — Большасць нашых інстытутаў, у тым ліку эканомікі, філасофіі і сацыялогіі, асабліва ў апошнія гады, робяць непасрэдныя захады па спробе інтэграцыі з вытворчасцю, па падтрымцы існуючых праграм і нават распрацоўцы ўласных. Нашы эканамісты ў гэтым плане наперадзе. Калі не планеты, то Беларусі дакладна. Яны прымалі ўдзел у распрацоўцы буйных дзяржаўных праграм у галіне навукова-тэхнічнага і інавацыйнага развіцця. Сярод іх можна назваць Праграму развіцця ў Рэспубліцы Беларусь лагістычнай сістэмы на перыяд да 2015 года, Комплексны прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу Рэспублікі Беларусь на 2011—2030 гады з больш падрабязным яго абгрунтаваннем на 2011—2015 гады і іншыя.

Інстытутам філасофіі апошнім часам арганізавана звыш 30 навукова-метадычных семінараў, якія праводзіліся непасрэдна для кіраўнікоў, інжынераў, супрацоўнікаў збытавых падраздзяленняў і аддзелаў кадраў. Такія семінары прайшлі ў Мінску і ў некаторых рэгіёнах Беларусі, у прыватнасці, у Баранавічах. Яшчэ адно з цікавых пачынанняў Інстытута эканомікі — спроба стварэння сеткі філіялаў інстытута, якія павінны працаваць на гаспадарча-разліковых прынцыпах: Цэнтр фарсайт-даследаванняў для выканання пілотных і поўнамаштабных праектаў нацыянальнага і наднацыянальнага ўзроўню, у якім выказана зацікаўленасць кіраўніцтва Саюзнай дзяржавы, Цэнтр бізнес-праектавання і Цэнтр эканоміка-прававых даследаванняў.

**С. Алейнікава:** — Чым вызначаецца навука? У першую чаргу — сістэмай адукацыі. Калі казаць пра нашу сістэму адукацыі, то зацверджаная, прызнаная ва ўсім свеце савецкая навуковая спадчына, ад якой мы вельмі лёгка адмовіліся, перайшоўшы на сістэму Балонскага працэсу, яшчэ не сказала свайго слова. На мой погляд, гэты непрадуманы пераход быў не патрэбен. Патлумачу. Раней атрыманне вышэйшай адукацыі прадугледжвала навучанне па спецыяльнасці і засваенне гуманітарнага блока. Цяперашняя вышэйшая адукацыя, якая ўжо стала чатырохгадовай, прадугледжвае атрыманне толькі спецыяльнасці, гуманітарны блок зрэзаны. А што такое атрыманне спецыяльнасці? Па старых савецкіх мерках, гэта ПТВ ці тэхнікум, у той час як ВНУ забяспечвала студэнта тэарэтычнай і метадалагічнай базай — тым, што давала магчымасць фарміраваць навуковы светапогляд. Гэты пераход на бакалаўрыят, выдаліўшы гуманітарны блок, выкрасліў атрыманне вышэйшай адукацыі ў нашым сэнсе. У Еўропе зусім іншая сітуацыя. Там гэтая сістэма складвалася на працягу стагоддзяў, і ў іх такіх праблем няма. А ў нас была іншая сістэма, якая ў адно імгненне знікла.

**А. Шашко:** — Асабіста я гэтага пераходу да балонскай сістэмы не бачу. Першыя два курсы мы часткова давучваем студэнтаў таму, што яны не паспелі вывучыць у школе.

**Д. Рудакоў:** — Калі казаць пра стан сучаснай навукі, то трэба ўзгадаць статыстыку. Пры Савецкім Саюзе колькасць навукоўцаў складала 100 тысяч чалавек, сёння ў нас крыху больш за 30 тысяч. Колькасць паменшылася ў тры разы! Акрамя таго, адбываецца скарачэнне колькасці насельніцтва і ўсё больш адчуваецца розніца ў аплаце працы вучонага і рабочага.

**А. Іванец:** — Безумоўна, ёсць у нас і станоўчыя вынікі. Беларусь — адна з нешматлікіх краін постсавецкай прасторы, якая захавала сістэматычнасць даследаванняў. У чым яна заключаецца? У тым, што нашай навуцы характэрна пэўная структура: ёсць арганізацыі, якія курыруюць тыя ці іншыя навуковыя кірункі, ёсць міжведамасныя экспертныя саветы, якія іх вызначаюць, ёсць падрыхтоўка навуковых кадраў, без чаго навука проста не можа існаваць. Нядаўна да нас у Акадэмію навук прыязджалі калегі з суседніх краін. Як высветлілася, яны практычна нічога гэтага не захавалі. У тым жа Казахстане такое паняцце, як кандыдат навук, звялі да нуля. Украіна ўвогуле стаіць на парозе таго, каб распускаць саветы па абароне дысертацый. У Расіі ўсё ідзе да таго, што падрыхтоўку аспірантаў будуць ажыццяўляць толькі ВНУ, у расійскай Акадэміі навук гэтае права адбіраюць. Так што наша навука яшчэ ў вельмі добрым становішчы.

## Дарогу — маладым. Ці будучыня навукі за вопытам старэйшага пакалення?

**К. Разуванава:** — Што тычыцца моладзі, то яна ўдзельнічае практычна ва ўсіх значных буйных праектах, якія рэалізуюцца Аддзяленнем гуманітарных навук і мастацтваў. І гэта зразумела, паколькі даволі складана, яшчэ не маючы значнага досведу, праводзіць самастойныя маштабныя даследаванні. Таму часцей за ўсё гэта сумесныя праекты. З аднаго боку, гэта магчымасць для моладзі паглядзець і скарыстаць вопыт старэйшага пакалення, з другога — падрыхтоўка будучых кадраў. Напрыклад, моладзь Інстытута сацыялогіі ўдзельнічае ў падрыхтоўцы вялікай колькасці сацыялагічных аглядаў, рэкамендацый і прагнозаў, у тым ліку для органаў дзяржаўнага кіравання. Адзін з апошніх — матывацыя моладзі ў цэлым і яе скіраванасць на пашырэнне ўласнай адукацыі.

**В. Маразевіч:** — Не варта казаць, што на маладых навукоўцаў сёння робіцца стаўка і менавіта за імі развіццё беларускай навукі і будучыня краіны ў цэлым.

**С. Алейнікава:** — Навуку ўвогуле нельга дзяліць на сталую і маладую. Навука — агульны працэс. І ўсе даследаванні, якія праводзяць як маладыя, так і старэйшыя навукоўцы, аднолькава вартыя. У Маршака ёсць цудоўная эпіграма, якую ён пісаў маладому паэту, які такім сябе лічыў: «Зачем о молодости лет ты сообщаешь публике читающей? Тот, кто еще не начал, не поэт; а тот, кто начал, тот не начинающий». Гэта тычыцца і вучоных: той, хто пачаў займацца навукай, проста навуковец.

**В. Крукоўская:** — У тых умовах, у якіх працую я, моладзі з вядомымі дасягненнямі вельмі мала. Аднак у той жа час усе маладыя навукоўцы актыўна задзейнічаны ў вялікіх праектах. Гэта тыя людзі, на якіх у сваёй штодзённай рабоце абапіраюцца вядомыя навукоўцы, яны выконваюць шэраговыя задачы. Таму чакаць таго, што менавіта ў маладога вучонага будзе асабістая ўнікальная распрацоўка ці адкрыццё, не зусім карэктна, бо такая сітуацыя, што ў асноўным мы працуем над агульнымі праектамі. Тым не менш у маладога спецыяліста ёсць усе шанцы рэалізаваць сябе ў межах вялікіх праектаў. Усе ідэі ў такім выпадку выслухаюць, праўда, не заўсёды яны будуць рэалізаваны. Хутчэй за ўсё, тут нават ідзе канкурэнцыя не столькі паміж калектывамі, колькі сярод кірункаў дзейнасці і паміж інтарэсамі ў тым ліку. Усе ідэі, якія ў мяне ёсць, я магу рэалізаваць у агульных праектах. У мяне няма неабходнасці адасабляцца. І гэта нашмат цікавей — быць часткай вялікіх праектаў. Прычым, каб рэалізаваць уласны праект, усё роўна трэба сабраць вялікую каманду.

**Д. Рудакоў:** — Не зусім згодзен. Ёсць Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў, дзе праводзяцца шматлікія конкурсы: сумесныя, моладзевыя. Магчыма, па фінансаванні яны не такія значныя, але, тым не менш, пэўную ідэю тут можна паспрабаваць рэалізаваць: атрымаць фінансаванне, апублікавацца. Іншая справа, што глабальныя рэчы ніхто фінансаваць не стане, бо гэта дарагое абсталяванне і рэактывы, праца людзей, якім таксама трэба плаціць грошы.

**К. Разуванава:** — Прайшоў час збору персанальных камп'ютараў у гаражы. Зараз, каб распрацаваць глабальную значную ідэю, неабходна каманда.

**Д. Рудакоў:** — Прычым каманда прафесіяналаў! І тут узнікае праблема. Часта такое бывае, што кандыдаты навук пакідаюць акадэмію, і мы, па сутнасці, забяспечваем вытворчасць элітнымі кадрамі.

**В. Маразевіч:** — А чаму чалавек, які мае веды, ступень і вопыт, не можа прымяніць гэта ўсё на практыцы і атрымаць ад гэтага аддачу? Няўжо гэта дрэнна? Наадварот, атрымаўшы на практыцы больш вопыту, ён можа вярнуцца ў навуку і зрабіць пэўнае адкрыццё.

Часцей за ўсё даследаванне — гэта каманда. Іншая справа, якая каманда, як яна працуе і што дае? Трэба разумець, што доктар навук — чалавек, які выхаваў каманду, якая, у сваю чаргу, дапамагла яму, бо самастойна, не ўлічваючы думкі і погляды калег, праводзіць даследаванні немагчыма. У нашай галіне ў тым ліку. Аднак каманда можа быць значна меншай. Той жа фонд фундаментальных даследаванняў для эканамічных праектаў — больш рэальнае фінансаванне ў тым плане, што нам якраз не трэба мець спецыяльнага абсталявання і рэактываў. На жаль, фінансаванне ў навуковую дзейнасць не такое, як хацелася б — калі б можна было ўтрымліваць сям'ю, займаючыся толькі навукай. Дарэчы, у эканамічным універсітэце існуе такая тэндэнцыя, што сярод маладых навукоўцаў пераважаюць жанчыны.

**А. Іванец:** — Увогуле, у рэспубліцы жанчыны сярод навукоўцаў складаюць 51,5 %.

**А. Шашко:** — Займаючыся толькі навукай, маладому навукоўцу выжыць вельмі складана. Назаву некалькі лічбаў. Па звестках Белстата за кастрычнік, у сярэднім заробак прафесарска-выкладчыцкага складу быў дзесьці 6,1 мільёна, па навукова-даследчыцкіх установах — 7,3 мільёна, што прыкладна на 20 % больш. Калі ж узяць стыпендыю аспіранта — гэта каля 2 мільёнаў, што на мяжы пражытковага мінімуму. Гэта вельмі адрозніваецца ад Захаду. Там малады чалавек можа дазволіць сабе займацца толькі навукай. Яму выплачваюць стыпендыю, ён крыху выкладае, а галоўнае — ён павінен вучыцца, публікавацца, пісаць працы. Калі ён перастане гэта рабіць, яго адлічваюць: усё вельмі проста. У нас аспіранту выжыць на стыпендыю вельмі складана, таму ён вымушаны займацца чым заўгодна, толькі не навуковай дзейнасцю.

**Д. Рудакоў:** — У рэальнасці ў Акадэміі навук кандыдат навук, дацэнт, калі ён працуе выключна па бюджэтнай тэматыцы, атрымлівае крыху больш за 4 мільёны. Калі ён яшчэ ўдзельнічае ў дадатковых праектах, тады яго заробак павышаецца.

**Т. Пліско:** — Зараз нават стаўленне да тых, хто любіць вучыцца, змянілася. Прапаганда масавай культуры сёння далёка наперадзе. Быць «батанікам» — сёння не зусім добра. Займацца навукай ужо не модна.

**В. Маразевіч:** — Я з гэтым не пагаджуся. Магу распавесці пра сваіх аднакурснікаў. Многія, хто пайшоў з навукі ў вытворчасць, у свой час прыйшлі да таго, што сталі атрымліваць альбо другую вышэйшую адукацыю, альбо сваю дзейнасць зарыентавалі на навуку. Яны перастройваюць свой светапогляд; адзінае, што яны па-іншаму ставяцца да навукі: не як да асноўнага кірунку дзейнасці, а да таго, што можа ім забяспечыць лепшае існаванне. Эканамісты разумеюць, што трэба альбо пайсці кудысьці для атрымання вопыту, каб мець магчымасць нешта даследаваць, альбо наладжваць пэўнае супрацоўніцтва.

**Д. Рудакоў:** — Аднак не трэба забывацца, што вялікія адкрыцці здзяйснялі менавіта маладыя вучоныя!

**К. Разуванава:** — Узгадайце даволі стары фільм «Доказ» з Энтані Хопкінсам, гэтую трывалую фразу, што матэматыкі сябе рэалізуюць да 26 гадоў. У гуманітарыяў усё інакш: каб «уключыць» паўнавартаснае аналітычнае мысленне і пабачыць праблему больш шырока, ім неабходна назапасіць пэўны жыццёвы вопыт і веды. Славутыя гісторыкі, сацыёлагі, а асабліва філосафы, — гэта людзі ва ўзросце не менш за 30 гадоў, а часцей — пасля 35-ці.

## Спрэчка «фізікаў» і «лірыкаў»: у чым яна сёння?

**А. Іванец:** — Сёння найбольш агульнапрызнанымі кірункамі, у якіх працуюць беларускія навукоўцы, з'яўляюцца фізіка, хімія, біяхімія ў прыватнасці, фармацэўтыка, матэрыялазнаўства.

**А. Шашко:** — У БДУ таксама галіновая скіраванасць мае вялікае значэнне. Фізіка, хімія, біялогія ў нас знаходзяць прымяненне. Как казаць пра гуманітарную навуку, яна, вядома, не на такім жа ўзроўні, але ёсць. Напрыклад, нашы маладыя вучоныя, што тычыцца маркетынгу і электроннага бізнесу, увесь час задзейнічаны. У прыватнасці, сёлета яны распрацавалі праект па маркетынгавым даследаванні для кампаніі «Лукойл».

> **Каб у нас было нобелеўскае прызнанне, перш за ўсё, трэба, каб нашы беларускія калегі працавалі ў складзе калектываў агульнавядомых сусветных грантаў. Толькі ў такім выпадку можна атрымаць нобелеўскую прэмію.**

**В. Маразевіч:** — У ідэале, навуковец ВНУ — той чалавек, які навукай зацікавіўся ўжо ў студэнцкія гады, затым паступіў у магістратуру, пасля ў аспірантуру, застаўся ў ВНУ, затым, магчыма, пайшоў працаваць на канкрэтную вытворчасць. Адным словам, навука ВНУ ўяўляе сабой спалучэнне кірункаў дзейнасці. Мне здаецца, што, улічваючы ўмовы, у якіх яна знаходзіцца сёння, гэта выхад са становішча. Навука павінна быць цікавай для даследчыка, але яна неабавязкова павінна з'яўляецца адзіным кірункам дзейнасці ў чалавека. І мы ў сваім савеце імкнёмся паказаць, што навуковец — не чалавек з ускудлачанымі валасамі і ў акулярах, які сябруе толькі з кнігамі, а гэта малады, прагрэсіўны, крэатыўны чалавек, якога цікавіць усё, ён не зацыклены на чымсьці адным. Напэўна, для прадстаўнікоў фундаментальнай навукі гэта не вельмі правільна: калі перастаеш думаць пра тое, што цікавіць, вельмі хутка выпадаеш з гэтага працэсу і туды вельмі складана вярнуцца. Справай трэба займацца пастаянна. Але, як паказвае жыццё, можна праяўляць сябе ў некалькіх кірунках і рабіць гэта аднолькава эфектыўна.

**К. Разуванава:** — У сутках 24 гадзіны. Немагчыма стаяць паўдня каля станка і пры гэтым займацца навукай. Неабходна дамагацца, каб не было перакосаў да таго, што тыя людзі, якія здольны да аналітычнага мыслення, вымушаны цалкам заціснуць сябе ў межы практычнай дзейнасці. Аналітычная праца — як вывучэнне замежнай мовы. Калі ты не размаўляеш на ёй месяц, ты страчваеш слоўнікавы запас, на ўзнаўленне якога спатрэбіцца два месяцы. А як быць з філасофіяй? Менавіта філасофія — адна з першых навук гуманітарнага цыкла, якая ўвогуле адказвае за распрацоўку механізма любога даследавання. Менавіта філосафы адначасова з сацыёлагамі дапамагаюць нейкім чынам асэнсаваць глабалізацыйныя працэсы і падрыхтаваць насельніцтва да ўспрыняцця новых тэндэнцый.

**С. Алейнікава:** — Уся постсавецкая прастора сутыкнулася з крызісам ідэнтычнасці і фарміраваннем нацыянальнай ідэалогіі. У нас шмат распрацавалі добрых падручнікаў па ідэалогіі, але ўсё роўна нацыянальная ідэя так і застаецца ў пошуку, яна не фарміруецца адразу. І за гэта адказваюць, у першую чаргу, філасофія, гісторыя і сацыялогія. Але, тым не менш, сёння назіраецца, што гуманітарныя навукі ідуць па сыходнай. Спадзяюся, што гэта толькі адаптацыйны працэс.

**Д. Рудакоў:** — З іншага боку, калі навукоўцы з тэарэтыкаў пераходзяць у практыкі, іх пачынаюць цаніць. Мае калегі, якія перайшлі ў фармацэўтычную кампанію, праз некаторы час прасунуліся па службовай лесвіцы. Чаму? Ёсць веды, навыкі, досвед і вучоная ступень. З аднаго боку, навука як сярэднестатыстычная велічыня не зусім запатрабавана дзяржавай, але як толькі мы пераходзім ад навукі да вытворчасці, статус вучонага павышаецца. Зараз будзе назірацца канкурэнцыя паміж фундаментальнымі ведамі і вытворчасцю, дзе можна зарабіць грошы: хутка і не напружваючыся. Тым не менш, са свайго вопыту ведаю, што і ў навуцы можна зарабіць. Існуе пэўны попыт на хімічныя тэхналогіі, на тэхналогіі ў галіне фармацэўтыкі. Іншая справа, што не ўсе гэтыя праекты могуць рэалізавацца з-за канфлікту інтарэсаў.

**Т. Пліско:** — Вельмі хацелася б, каб не нарастаў гэты перакос фінансавання паміж прыкладной і фундаментальнай навукамі. Асабліва каб на фундаментальныя даследаванні таксама звярталася ўвага дзяржавы. Бо калі ўкладваць сродкі толькі ў прыкладныя даследаванні, з часам фінансаваць не будзе чаго. На самой справе, калі маладыя навукоўцы мараць пра навуку, іх мары накіраваны на нешта фундаментальнае. Прыкладныя распрацоўкі — вядома, добра, але многія навукоўцы, у тым ліку і я, хочуць праводзіць тэарэтычныя даследаванні, што ў нас, на жаль, амаль не фінансуецца па прычыне дарагавізны.

**В. Крукоўская:** — Безумоўна, я разумею адрозненне паміж прыкладной і фундаментальнай навукамі. Аднак асабіста ў мяне жадання займацца толькі тэорыяй няма. Хутчэй наадварот, у выніку рашэння практычных задач усплывае іх тэарэтычны аспект. І тады я разумею, што патрэбна прыдумаць новы падыход, каб вырашыць канкрэтную задачу. Для сябе я пакуль не бачу іншага падыходу, які мяне б задавальняў.

## Вынаходствы маладых навукоўцаў: ці з'явяцца сярод нас нобелеўскія лаўрэаты?

**А. Іванец:** — Нобелеўская прэмія — толькі адзін агульнавядомы спосаб прызнання навукоўцаў. На самой справе, каб трапіць у лаўрэаты, трэба займацца не толькі беларускай навукай. Я ўвогуле катэгарычна супраць тэрміна «беларуская навука». Навука — працэс агульнасусветны. Ёсць даследаванні, якія праводзяцца беларускімі навукоўцамі. Каб у нас было нобелеўскае прызнанне, перш за ўсё, трэба, каб нашы беларускія калегі працавалі ў складзе калектываў агульнавядомых сусветных грантаў. Толькі ў такім выпадку можна атрымаць нобелеўскую прэмію. Той час, калі, седзячы ў сябе ў лабараторыі, можна было рабіць пэўнае адкрыццё, і назаўтра стаць нобелеўскім лаўрэатам, ужо прайшоў. Цяпер трэба працаваць у камандзе, якая рухаецца ў тым жа кірунку, што і вы. Толькі шчыльная кааперацыя і інтэграцыя ў агульнасусветную навуку можа прывесці да таго, што імя пачуюць у якасці нобелеўскага лаўрэата. Трэба разумець, што тады, хутчэй за ўсё, гэта будзе інтэрнацыянальны калектыў. Як паказвае час, камітэт, які вызначае лаўрэатаў, часцей за ўсё аддае перавагу якраз міжнацыянальным калектывам.

**В. Маразевіч:** — Што тычыцца прызнання, то, калі мы гаворым пра моладзевую навуку, не варта адразу думаць пра нобелеўскіх лаўрэатаў. Трэба сказаць, што ў нас дастаткова шмат даследаванняў маладых навукоўцаў і нават студэнтаў, прызнаных на міжнародных конкурсах і алімпіядах. Не валодаю звесткамі па ўсёй краіне, але скажу пра эканамічны ўніверсітэт. Толькі за мінулы год 73 студэнты перамаглі на міжнародных алімпіядах, 18 студэнтаў сталі стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта, што падкрэслівае значнасць даследаванняў і ўвагу дзяржавы да маладых навукоўцаў.

## Як укараніць вынаходкі навукоўцаў і атрымаць ад гэтага эканамічную выгаду?

**В. Маразевіч:** — Сёння перад намі, у тым ліку кіраўніком дзяржавы, пастаўлена задача: зрабіць так, каб беларуская навука прыносіла адчувальныя вынікі. І гэта зразумела: на жаль, эканоміка краіны абмежавана ў рэсурсах, і кіраўніцтва краіны, а таксама ўсе яе органы, якія праводзяць дзяржаўную палітыку, павінны імкнуцца да таго, каб любы ўкладзены ў пэўную справу рубель прыносіў аддачу. У тым ліку і навука. І тут узнікае вялікая праблема, якая стаіць перад навукоўцамі, бо большасць з іх марыць пра тое, каб проста тварыць, выношваць ідэі, магчыма, часам абсурдныя, не заўсёды практычна прымяняльныя.

**С. Алейнікава:** — У Акадэміі кіравання ўсе нашы ініцыятывы падтрымліваюцца кіраўніцтвам. Адзіная праблема, якая, напэўна, хвалюе многіх, — фінансаванне канферэнцый, якія праводзяцца за межамі нашай краіны. Што тычыцца шматлікіх праектаў, удзелу ў грантах і конкурсах, то мы атрымліваем абсалютную падтрымку.

Калі казаць наогул, то на постсавецкай прасторы фарміруецца спажывецкае стаўленне да навукі, калі яна асацыюецца са здзельна-прэміяльнай аплатай. Гэта перашкаджае ўсім, не толькі маладым. Фарміраванне жорсткага патрабавання аддачы навукі патрабуе дапрацоўкі. Асабліва гэта тычыцца гуманітарных навук. Таксама існуе праблема ўкаранення сваіх вынікаў. Вядома, лягчэй гэтага дасягнуць эканамістам і тэхнікам, якія блізкія да вытворчасці. Але якое можа быць укараненне ў філосафаў, гісторыкаў, педагогаў, палітолагаў, акрамя як у навучальны працэс?

**В. Маразевіч:** — Вельмі часта эканамісты самі шукаюць, дзе б ім уладкаваць свае навуковыя даследаванні, а прамысловасць, у сваю чаргу, мае патрэбу ў эканамічным абгрунтаванні вынікаў з тлумачэннем шляхоў вываду на рынак, з вырашэннем маркетынгавых задач. Ёсць праблема і ў тым, як зрабіць даследаванне вядомым і папулярным, каб яно прынесла эканамічную аддачу. Мне здаецца, што адзін з кірункаў развіцця навукі — кааперацыя на стыку абласцей: тэхнічная галіна з эканамічнай, медыцына з эканомікай і г. д. Каб вырашыць гэтыя праблемы, ёсць некалькі спосабаў, якія ўжо прымяняюцца ў БДЭУ. Па-першае, на некаторых прадпрыемствах створаны філіялы кафедраў, якія адказваюць, у тым ліку, за ініцыяцыю і фінансаванне навуковых даследаванняў. На жаль, значнай эканамічнай выгады такое ўзаемадзеянне пакуль не прыносіць. Другі спосаб — праўядзенне мэтавых даследаванняў. Напрыклад, міністэрствам адукацыі створаны так званы задачнік ад прамысловасці, калі прадпрыемствы фарміруюць пералік навуковых кірункаў, якія іх цікавяць, а ўжо ВНУ гэтыя даследаванні праводзяць. І ёсць трэці спосаб, зараз папулярны ў ВНУ, — стварэнне бізнес-інкубатараў, структуры, якая дазваляла б студэнтам рэалізоўваць свае бізнес-праекты ў спрошчаных умовах.

**К. Разуванава:** — Гэта сапраўды пытанне для прадстаўнікоў гуманітарных навук. Калі браць непасрэдна дзейнасць супрацоўнікаў Інстытута гісторыі, можна ўзгадаць шматлікія выпадкі, калі нашы археолагі ўдзельнічалі ў выкананні часам незапланаваных раскопак на месцах гістарычных помнікаў, якія трапляюць у зоны будаўніцтва, у першую чаргу — транспартнага. Калі размова вядзецца пра выкананне менавіта такіх работ — наймальнік плаціць грошы, каб археолагі своечасова раскапалі і закансервавалі знаходкі з гэтых помнікаў, якія, зразумела, потым застануцца ў музейных калекцыях, — то гэта прамая аддача. А як, напрыклад, палічыць эканамічную выгаду таго, што беларускія гісторыкі дапамагалі ў рэканструкцыі Мірскага замка? Па квітках? Ці як палічыць тую выгаду, калі, напрыклад, стане магчымым рэалізаваць прапановы гісторыкаў пры пераўтварэнні асобных тэрыторый Прыпяцкага заказніка ў турыстычную зону? Дзе тут будзе эканамічная аддача? Гуманітарныя навукі — вельмі тонкая і вельмі спецыфічная сфера, дзе часцей за ўсё эканамічная аддача адразу не настае.

**Д. Рудакоў:** — Усе хочуць, каб навука прыносіла прыбытак. З аднаго боку, гэта магчымасць зарабіць грошы самім вучоным, з другога — увасобіць іх ідэі ў жыццё. Я лічу, што ў беларускай навуцы сёння назіраецца крызіс. І ён аб'ектыўны, бо заснаваны на невысокім фінансаванні, спадзе нараджальнасці, і неўзабаве мы станем назіральнікамі барацьбы за чалавечы рэсурс. Безумоўна, большая частка людзей пойдзе на вытворчасць. Магчыма, гэта і добра. Чаму? У навуцы застанецца толькі яе эліта.

**В. Крукоўская:** — Сапраўды, у навуцы можна зарабіць. Аднак тыя грошы, якія выдзяляюцца на фундаментальную навуку, мінімальныя. Фундаментальная навука — задавальненне дарагое. Нашмат прасцей укладваць грошы ў прыкладныя даследаванні, дзе вынік навідавоку. Аднак для таго, каб заўтра атрымаць прыкладныя распрацоўкі, сёння трэба займацца фундаментальнай навукай. Таму зараз трэба знайсці пэўны баланс.

**А. Іванец:** — Чым больш на практыку мы будзем арыентавацца, тым ніжэйшае месца мы будзем займаць на агульнасусветным узроўні. Давайце паглядзім, колькі нобелеўскіх лаўрэатаў атрымалі эканамічны эфект ад сваіх адкрыццяў у той час, калі яны былі зроблены. Пра якое ўкараненне ідзе размова? У той час і паняцця не мелі, як можна пэўныя фізічныя законы прымяніць на практыцы. Па сутнасці, шматлікая тэхніка, тыя ж мабільныя тэлефоны, былі прыдуманы ўжо тады.

Мы павінны разумець дакладна, чаго мы сёння чакаем ад навукі. Каб яна зарабляла грошы? Ці мы будзем рыхтаваць спецыялістаў, каб быць тэхналагічна ўспрымальнай нацыяй? Колькі прыкладаў, калі прадпрыемствы купілі новае абсталяванне, усталявалі яго, а потым — калапс: прадпрыемства стаіць, бо няма спецыялістаў, якія працавалі б на новай тэхніцы. Калі мы гаворым пра тое, што мы хочам самі распрацоўваць тэхналогіі, то, прабачце, гэта ўжо зусім іншыя грашовыя выдаткі і іншыя часавыя прамежкі. У нашай краіне, у першую чаргу, мы павінны задумацца аб падрыхтоўцы спецыялістаў, якія змогуць успрыняць тое, што адбываецца ў свеце. У адваротным выпадку мы вельмі хутка прыйдзем да таго, што, нават купіўшы кітайскую тэхналогію, нам давядзецца купляць яшчэ і тысячы кітайцаў, якія будуць працаваць на гэтым абсталяванні. Трэба разумець, што мы знаходзімся ў агульнай сістэме. Таму нельга, каб невытворчая сфера была больш высокааплатнай, чым вытворчая.

**В. Маразевіч:** — Не толькі прадпрыемствы павінны фінансаваць навуку. У прынцыпе, усе гавораць аб адным і тым жа: дзяржава павінна выдаткоўваць сродкі на навуковыя даследаванні, якія яе цікавяць. А гэта грошы, якія дзесьці трэба знайсці. І мы, у сваю чаргу, разумеем, што гэта не так проста.

**А. Іванец:** — Трэба прызнаць, што навуковыя кадры сыходзяць. Вось у чым уся праблема. У лепшым выпадку спецыялісты ідуць у вытворчую сферу, у горшым — за мяжу, а яшчэ горш, калі яны ўвогуле развітваюцца з навуковай сферай. І спадзявацца на тое, што заўтра ўсе вернуцца, не варта.

Прычыны гэтага ў тым, што ў нас лічыцца, што пэўны патэнцыял ёсць у кожнага. На самой справе гэта далёка не так. Не з кожнага чалавека можна зрабіць алімпійскага чэмпіёна, не з кожнага атрымаецца і добры навуковец. Колькі людзей у нас несвядома выбірае спецыяльнасць пры паступленні ў ВНУ? Падыдзі да любога першакурсніка і спытай, чаму ён выбраў сваю спецыяльнасць? Ён скажа, што тут нізкі бал ці эканамісты зараз больш запатрабаваны. А пасля з гэтых людзей трэба вылучыць лепшых, якія пойдуць у магістратуру, у аспірантуру. Сёння ні для каго не сакрэт, што туды недабор. Конкурсу як такога няма. І ад гэтага пакутуюць усе. І калі мы не зразумеем, што здольных да навукі людзей вельмі мала, то гэта зробіць нехта за нас.

**Д. Рудакоў:** — Прычым з гэтых кандыдатаў навук павінны вырасці дактары навук. А калі іх менш, адпаведна, мала хто пойдзе ў дактарантуру. А што такое дактарантура? Гэта саветы па абароне дысертацый. І мы прыйдзем да таго, што хутка мы іх можам страціць.

## За чым будучыня беларускай навукі?

**С. Алейнікава:** — Сёння існуе праблема ўспрымання сучасным пакаленнем навукі як роду і як віду дзейнасці. Нядаўна ў Акадэміі кіравання мы праводзілі даследаванне сярод студэнтаў 1—5 курсаў і магістрантаў, у якім пыталіся, як яны бачаць будучыню навукі? З магістрантамі было ўсё прадказальна: яны ўжо зрабілі свой выбар. Што тычыцца астатніх, так, іх навуковая дзейнасць, безумоўна, цікавіць: яны ўдзельнічаюць у шматлікіх алімпіядах, канферэнцыях, семінарах, гуртках. Аднак, калі ўлічваць матывацыю студэнцкага ўдзелу ў навуцы, то гэта атрыманне прэферэнцый падчас залікаў і іспытаў, задавальненне асабістых інтарэсаў. Атрымліваецца, што сённяшняя моладзь пакуль разглядае навуку як клуб па інтарэсах. А ўсведамленне навукі як віду дзейнасці, жыццёвага шляху і прызвання ў сучаснага чалавека адсутнічае. Таксама мы вывучалі матывацыю тых, хто паступае ў магістратуру. Большасць з іх ставіць перад сабой мэту альбо адкласці на потым размеркаванне, альбо вырашыць яшчэ на два гады праблему працаўладкавання, пазбегнуць арміі ці атрымаць інтэрнат. І толькі 15% апытаных вызначыліся, што дакладна хочуць займацца навукай і магістратура — адна са ступеняў гэтага шляху. Прычым толькі 2% з іх мэтанакіравана плануюць паступаць у аспірантуру. Таму аб сфарміраванасці светапогляду пакуль казаць не прыходзіцца.

У спорце ёсць такі тэрмін, як крызіс пакаленняў. Гэта калі каманда выйграе некалькі гадоў запар, напрыклад, чэмпіянат свету, а потым у яе адны правалы. Ідзе змена пакаленняў. У навуцы гэтая змена пакаленняў хутка ажыццявіцца. І будзе яма — калі мы не станем клапаціцца пра гэта сёння, хаця б фарміруючы агульнае ўяўленне аб навуцы.

**К. Разуванава:** — Калі мы сёння гаворым пра трансфармацыю светапогляду, то хто, як не гуманітарыі, будзе яго мяняць і ўкараняць інавацыйнае мысленне сярод насельніцтва? У тым ліку трэба мяняць і стаўленне да навукоўцаў краіны. Аднак ёсць пэўныя паказчыкі, якія ўсё ж такі даюць аптымістычныя прагнозы. Напрыклад, толькі Інстытут гісторыі сёлета набраў 14 аспірантаў для розных формаў навучання. Прычым дзеля ўласнай падрыхтоўкі — усяго трэцюю частку. А гэта сведчыць пра тое, што не толькі дзяржаўныя навуковыя ўстановы гуманітарнай скіраванасці маюць патрэбу ў падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай катэгорыі, а і за межамі акадэмічнай сістэмы зацікаўленасць у такіх спецыялістах існуе. Пры гэтым неабходна сказаць, што захоўваецца сувязь Акадэміі навук з ВНУ. Так, напрыклад, сёлета сярод маладых вучоных Адзялення гуманітарных навук і мастацтваў 34 чалавекі выкладаюць у ВНУ (часцей на чвэрць стаўкі). З аднаго боку, гэта дазваляе больш пільна прыгледзецца да будучых магчымых аспірантаў і магістрантаў, з другога, праз уласны прыклад з'яўляецца магчымасць прыцягнуць моладзь у навуку. Таму ўсё ў нашых руках.

**В. Маразевіч:** — Сапраўды, у моладзі неабходна сфарміраваць патрэбу ў пазнанні і стварэнні чагосьці новага. На жаль, некаторыя абітурыенты прыходзяць у ВНУ не таму, што прагнуць ведаў, а таму, што так модна, так трэба і так хочуць іх бацькі. Таму навучальныя ўстановы павінны задумацца аб тым, якім чынам у моладзі сфарміраваць цікавасць да пазнання. Тут узнікае і іншае пытанне: хто і як накіроўвае маладога чалавека ў навуку? Я кажу пра кіраўнікоў. Хто такі сёння малады вучоны? Той, хто яшчэ ў студэнцтве захапіўся навукай, пасля застаўся ў ВНУ альбо пайшоў у Акадэмію навук і яму некалі прывілі гэтую цікавасць. А гэта быў канкрэтны чалавек — кіраўнік, уплыў якога на станаўленне навуковай моладзі значны. Таму сёння вельмі важна звярнуць увагу і на тое, што стымул для кіраўнікоў таксама павінен быць.

**А. Шашко:** — У нас захоўваецца савецкая традыцыя развіваць усё і адразу. А сёння, магчыма, усё ж трэба засяродзіць увагу на чымсьці больш прарыўным. Хачу нагадаць, што ў 2011 годзе быў падрыхтаваны агляд інавацыйнага развіцця краіны, дзе шмат казалася пра тое, што кадравы патэнцыял навукі ў нас яшчэ высокі. Аднак там было вылучана некалькі праблем, адна з якіх — узаемасувязь з практыкай. І для маладых навукоўцаў гэта вельмі важна. Таму будучыня беларускай навукі — за зваротнай сувяззю ад рэальнага сектара, дзяржаўных органаў, каб існавала зацікаўленасць за пэўныя даследаванні плаціць грошы. А пакуль у многіх прадпрыемствах іншая палітыка: вы нам штосьці зрабіце, калі нас задаволіць, мы вам заплацім.

**Д. Рудакоў:** — Я хачу на асабістым прыкладзе даказаць, што працаваць у навуцы цікава, што часам і там можна зарабіць грошы. Праз два гады я збіраюся паступаць у дактарантуру. Аддаў 10-гадовую працу па сваёй тэматыцы ў выдавецтва «Lambert», і ў мяне на руках ужо ёсць надрукаваны варыянт манаграфіі, якая неўзабаве выйдзе ў свет.

**С. Алейнікава:** — Безумоўна, моладзь ідзе ў навуку. Не столькі, колькі хацелася б, але ўсё ж такі ідзе. І ёсць вельмі таленавітыя «зорачкі», якія з'яўляюцца кожны год. Напэўна, шмат «зорачак» быць не можа. Адну, дзве, тры я ў Акадэміі кіравання штогод лаўлю, і абавязкова гэтыя людзі ідуць у навуку, каб аддаць краіне і грамадству тое, што іх цікавіць. Таму перспектывы заўсёды ёсць.

**А. Іванец:** — Пастаянна ідуць размовы аб пэўных праграмах, перспектывах, развіцці... Я хачу звярнуць увагу на такі аспект: без тых людзей, якія будуць ажыццяўляць усё гэта, здольных, ахвочых, усе гэтыя перспектывы будуць значыцца толькі на паперы. Наш народ — беларусы — дастаткова інтэлектуальная і адукаваная нацыя. Так, ёсць пэўныя прабелы ў сістэме адукацыі. Аднак, калі мы, пачынаючы з увагі дзяржавы ці пэўных чалавечых адносін, зможам гэты патэнцыял вылучыць, узрасціць, паставіць на ногі, то будзе будучыня і ў нашай беларускай навуцы. Калі ж мы сёння павернемся да гэтага спінай, то страцім вельмі шмат. Трэба разумець: калі ты разрэжаш вяроўку, а пасля яе ніткі пасцягваеш у розныя бакі, ты потым яе не зробіш такой, якой яна была дагэтуль. Таму вельмі хочацца, каб усе павярнуліся да навукі тварам. А мы, у сваю чаргу, не падвядзём!

**Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

■ Фінансавы выдатнік

# ТОЛЬКІ ДАКРАНУЎСЯ — І ЗАПЛАЦІЎ

**Нядаўна ад аднаго знаёмага я пачуў новы аргумент супраць безнаяўных разлікаў. Быццам з плацежнай карткай таксама не надта зручна ў краму хадзіць — трэба картку, як і грошы, даць касіру, пасля ўвесці ПІН-код ці падпісаць чэк. Маўляў, час гэта зусім не эканоміць. Можа быць, і так, але ёсць чым адказаць і такім скептыкам. Ужо існуе новае пакаленне плацежных картак — бескантактныя. Аб тым, што гэта за «звер» такі, расказвае Алена Лагуніна, начальнік упраўлення развіцця Разліковага цэнтра пластыкавых картак Беларусбанка.**




«Мабыць, самы новы від картак, які з'явіўся ў Беларусі і з якім працуюць яшчэ далёка не ўсе беларускія банкі, — бескантактныя карткі Visa PayWave і MasterCard PayPass, — разважае спецыяліст. — Іх асаблівасць у тым, што, дзякуючы ўбудаванай антэне, для правядзення куплі дастаткова дакрануцца да счытвальнай прылады спецыяльнага плацежнага тэрмінала і не перадаваць картку касіру. Гэта забяспечвае вялікую хуткасць аперацый з карткай разам з іх бяспекай».

На жаль, сёння ў нашай краіне пакуль мала плацежных тэрміналаў, якія абслугоўваюць бескантактныя карткі. Але выпрабаваць інавацыйную тэхналогію правядзення плацяжоў ужо можна ў некалькіх сотнях гандлёвых арганізацый. «У іх ліку такія сталічныя прадпрыемствы, як «ЦУМ», універмаг «Беларусь», гандлёвы дом «На Нямізе», «Лідо», — пералічвае спадарыня Лагуніна і дадае: — У той жа час, бескантактныя карткі могуць абслугоўвацца і ў любым стандартным абсталяванні, бо маюць магнітную паласу і мікрапрацэсар». Спецыяліст сцвярджае, што ў сумежных краінах (Польшча, Расія), куды можна выправіцца ў падарожжа з бескантактнымі міжнароднымі карткамі, інфраструктура абслугоўвання новага пакалення картак развіта ўжо дастаткова добра.

**«Бескантактныя карткі могуць абслугоўвацца і ў любым стандартным абсталяванні, бо маюць магнітную паласу і мікрапрацэсар».**

Між іншым, бескантактная картка афармляецца гэтак жа, як і звычайная: неабходна звярнуцца ў банк, які ажыццяўляе выпуск такіх картак (у тым ліку Беларусбанк), з пашпартам і заключыць дагавор. Варта адзначыць, што бескантактную картку можна аформіць да рахунку, які ўжо існуе. «Але вялікай неабходнасці мець да рахунку і стандартную картку, і бескантактную няма, бо апошняя прымаецца ва ўсіх стандартных месцах — банкаматах, інфакіёсках, гандлёвых пунктах», — запэўнівае Алена Лагуніна.

❒❒❒

***Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.***

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Нестановичи-Агро» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже**

**здания ремонтной мастерской**

**(здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) общей площадью 1954.0 кв.м (инв. № 601/С-22624), расположенного на земельном участке площадью 0,5332 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Победы, 86, корп. 4**

**Начальная цена с НДС – 2 942 400 000 бел. руб.**

Задаток, 10% от начальной цены (294 240 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 690324015, ОКПО 29250255 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 09.11.2013.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.12.2013 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.12.2013 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона) по поручению
Открытого акционерного общества «АЛЬБА» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества в составе:**

**здание производственного назначения**

**общей площадью 36,1 кв.м (инв. №621/С-25443),**

**здание производственного назначения**

**общей площадью 398,9 кв.м (инв. №621/С-25444), объекты расположены на земельном участке площадью 0,9179 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Несвижский район, г. Несвиж, ул. К. Либкнехта, 137.**

**Начальная цена с НДС – 207 672 000 бел. руб.**

Задаток, 10% от начальной цены (20 767 000 бел. руб.), перечисляется: на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.04.2013.*

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.12.2013 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.12.2013 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

# ПАТРЭБНА ЖЫЛЛЁ? ДЫК Я «ПАСАДЗЕЙНІЧАЮ»

**У СІЗА Камітэта дзяржбяспекі змешчаны 22-гадовы беларус, які прапаноўваў суграмадзянам набыццё кватэр у сталіцы праз жыллёва-будаўнічы кааператыў за асобнае ўзнагароджанне. Малады чалавек выдаваў сябе за супрацоўніка спецыяльнага падраздзялення КДБ Беларусі і намесніка фонду афіцэрскага жылля.**

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:
**1- и 2-комнатные квартиры – 14 600 000 руб.**
**3-комнатные квартиры – 14 500 000 руб.**

**Условия оплаты:**
**50% от стоимости квартиры – в течение 15 банковских дней с момента регистрации договора;**
**20% от стоимости квартиры – в течение месяца;**
**20% от стоимости квартиры – в течение месяца;**
**10% от стоимости квартиры – в течение месяца.**

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 29 декабря 2012 г. № 500/1001-1788. Площадь земельного участка – 4,1803 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 131.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:
помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие не несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 3-й квартал 2013 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 3-й квартал 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 67 квартир, из них 11 однокомнатных общей площадью 44,92 м² жилой площадью 17,96 м², 20 однокомнатных общей площадью 45,17 м² жилой площадью 17,96 м², 12 двухкомнатных общей площадью 60,32 м² жилой площадью 31,09 м², 21 двухкомнатная общей площадью 60,57 м² жилой площадью 31,09 м², 2 трехкомнатные квартиры общей площадью 78,05 м² жилой площадью 45,1 м², 1 трехкомнатная квартира общей площадью 77,8 м² жилой площадью 45,1 м².

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**
Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207-19-15) с 19 декабря 2013 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник-четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом № 4 по генплану»)

**Информация о застройщике**: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:
1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства:**
Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству 70% общей площади жилых помещений граждан из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска.

Положительное заключение государственной экспертизы № 282-15/12 от 16.05.2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 4 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь строительства.

**Характеристика объекта.**
Объект – 119-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом серии М111-90 (БС-40) с помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:
**при условии внесения 100% оплаты в срок 20 банковских дней с момента регистрации договора– 12 900 000 руб.;**
**при условии поэтапной оплаты – 13 800 000 руб.**

**Условия поэтапной оплаты:**
**40% от стоимости квартиры – в течение 10 банковских дней с момента регистрации договора;**
**30% от стоимости квартиры – в течение следующих за сроком оплаты первого взноса 10 банковских дней;**
**10% от стоимости квартиры – в течение месяца (февраль 2014);**
**10% от стоимости квартиры – в течение месяца (март 2014);**
**10% от стоимости квартиры – в течение месяца (апрель 2014).**

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (при условии поэтапной оплаты) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 21 мая 2012 г. № 500/600-2122. Площадь земельного участка – 0,1846 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:
помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие не несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 3-й квартал 2013 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 2-й квартал 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 39 двухкомнатных квартир общей площадью 57,94 м² жилой площадью 29,29 м².

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**
Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207-19-15) с 23 декабря 2013 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

■ Інфарм-укол

# ВОСЬ ТАБЕ ГРЫП, А ВОСЬ — ПРАСТУДА

**Спецыялісты-медыкі перакананы, што людзі, якія шукаюць інфармацыю адносна прастуды і грыпу ў інтэрнэце, атрымліваюць шмат дэзынфармацыі.**

## ПРАЎДА

Грып выклікаюць вірусы трох тыпаў: А, В і С. Два першыя выклікаюць сезонныя эпідэміі ў зімовы час. Вірус С выклікае лёгкія рэспіраторныя захворванні, якія не перарастаюць у эпідэміі.

Вірусаў, якія выклікаюць прастуды, значна больш. Адно толькі сямейства рынавірусаў налічвае сотню відаў. Яны «актуальныя» з верасня па май, хоць выпадкі заражэння назіраюцца і ў астатнія месяцы.

Сімптомы грыпу праяўляюцца ў высокай тэмпературы і мышачных болях. Грып можа выклікаць ускладненні ў людзей старэйшага ўзросту або з хранічнымі захворваннямі.

Прастуду выклікае не холад, а вірус. Разам з тым, не варта знаходзіцца на халодным паветры без адзення або з мокрымі валасамі, паколькі гэта можа актывізаваць вірусы, якія ёсць у нас.

Пераахаладжэнне можа выклікаць пнеўманію, але не прастуду або грып. У любым выпадку рэкамендуецца пазбягаць рэзкіх перападаў тэмпературы.

Знаходжанне ў дрэнна праветраных памяшканнях, дзе знаходзіцца шмат людзей, а паветра надта сухое — сур'ёзны фактар для пачатку захворвання.

## НЯПРАЎДА

### Захутацца, каб прапацець

Насамрэч не рэкамендуецца празмерна ўхутвацца і прымаць цёплыя ванны, каб «асвяжыць» арганізм. Потааддзяленне — фізіялагічны працэс, які закліканы не дапусціць павышэння тэмпературы цела. Калі мы празмерна ўхутваемся, пот ахалоджваецца на скуры і можа выклікаць дрыжыкі або павышаную тэмпературу.

### Зачыніць вокны

Насамрэч іх трэба перыядычна адчыняць на 10 хвілін. Надта цёплыя месцы з'яўляюцца спрыяльным асяроддзем для вірусаў. Як і надта сухія. Чым больш сухое паветра, тым больш мы падвяргаемся рэспіраторным захворванням.

### Вытрымліваць дыету

Насамрэч трэба есці ўсё, што хочацца, піць больш вадкасці. Пры высокай тэмпературы і ўзмоцненым потааддзяленні неабходна павялічыць прыём вадкасці (вады, сокаў, травяной гарбаты). Калі піць іх цёплымі, яны змякчаюць кашаль.

### Выпіць каньяку з малаком перад сном

Спіртное не можа прадухіліць прастуду! Глыток моцнага напою дапамагае разагрэць арганізм і паляпшае самаадчуванне, але гэта праходзіць. Алкаголь ніяк не ўздзейнічае на сімптомы. Што да малака, то яно можа ўзмацніць аддзяленне макроты. Таму яго можна замяняць вадкасцю расліннага паходжання.

### Існуюць вакцыны ад прастуды

Вакцын ад прастуды не існуе, паколькі яе можа выклікаць любы з 200 вірусаў. Ёсць вакцыны ад грыпу, паколькі яго выклікаюць усяго тры тыпы вірусаў, але гэта таксама пытанне неадназначнае. Бялкі, якія пакрываюць вірус грыпу, натуральным чынам змяняюцца, і імунная сістэма не распазнае яго, а абараніцца ад новых формаў віруса — няпростая задача. Хваравіты стан, які чалавек перажывае падчас грыпу або прастуды, з'яўляецца вынікам звышактыўнага стану нашай імуннай сістэмы. Калі яна бачыць невядомага «агрэсара», то і рэагуе несуразмерна. Рэдка бывае, што чалавек хварэе на прастуду ад адной і той жа інфекцыі або на грып ад аднаго і таго ж віруса. Вакцыны падрыхтоўваюць абарончыя механізму чалавека да адбівання пэўнага віду агрэсара. Як бы там ні было, вакцынацыя застаецца самай эфектыўнай мерай папярэджвання захворвання на грып, і вельмі важна праводзіць яе пасля 60 гадоў або пры хранічных захворваннях.

### Антыбіётыкі лечаць усё

Насамрэч яны не папярэджваюць ні грып, ні прастуды. З-за бескантрольнага ўжывання антыбіётыкаў фармацэўтычная прамысловасць і медыцынская грамадскасць некаторых краін праводзяць нават спецыяльныя кампаніі.



### Вітамін С, пропаліс, эхінацэя — першыя памочнікі пры прастудзе

Яўных доказаў карысці гэтых прадуктаў няма. Не даказана, што вялікія дозы вітаміну С прадухіляюць прастуду, але гэта не азначае, што трэба перастаць ужываць фрукты з гэтым вітамінам. Некаторыя вучоныя заяўляюць, што ўжыванне дадатковай колькасці вітаміну С не спрыяе ўмацаванню імуннай сістэмы і зніжэнню рызыкі захворвання. Аднак у выпадку прастуды або грыпу дзейнасць клетак імуннай сістэмы ўзрастае, патрабуючы большай колькасці вітаміну С. Штодзённае ўжыванне 200 мг вітаміну С скарачае працягласць прастуды дзесьці на 14 працэнтаў у дзяцей і на 8 працэнтаў у дарослых. Тое ж самае можна сказаць і ў дачыненні да эхінацэі, пропалісу і іншых раслін. Яны змяншаюць сімптомы грыпу.

## КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

### Пра цёплы булён

Даследчыкі ўжо даўно вывучылі вартасці курынага булёну. Вітаміны і спажыўныя рэчывы, якія змяшчаюцца там, валодаюць супрацьзапаленчым дзеяннем. Нельга забывацца пра карысць цыбулі, морквы, рэпы, сельдэрэю і пятрушкі, якія таксама часта дадаюць у булён. Акрамя таго, падчас варкі курынае мяса аддае амінакіслату з хімічнымі вартасцямі, падобнымі на лекавы сродак, які прызначаецца пры бранхіце і іншых рэспіраторных захворваннях.

### Пра хатні рэжым

Калі вы будзеце працаваць або наведваць навучальную ўстанову, гэта наўрад ці павялічыць працягласць прастуды, але павялічыць рызыку заражэння навакольных. Вельмі важна прыкрываць рот і нос падчас чхання, карыстацца папяровымі насоўкамі, часта мыць рукі. Пры вострых сімптомах варта ўсё ж такі заставацца дома і вытрымліваць рэжым спакою. Сон таксама спрыяе выздараўленню.

### Пра зварот да ўрача

Прастуда, як правіла, праходзіць без лячэння. Дастаткова прытрымлівацца правілаў асабістай гігіены, правільна харчавацца, піць цёплую вадкасць, адпачываць, прымаць анальгетыкі. Калі грып працякае без ускладненняў, то дастаткова таксама вытрымліваць агульныя правілы. Аднак калі высокая тэмпература трымаецца доўга, варта звярнуцца да ўрача. Калі тэмпература трымаецца 3—4 дні, насмарк — 10 дзён, а кашаль 2—3 тыдні, то гэта нармальна. Сімптомы могуць праяўляцца на працягу двух тыдняў у кожным чацвёртым выпадку. Варта толькі сачыць, каб не было ўскладненняў — пнеўманіі ці бранхіту.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Вільнюс і Мінск звяжа трансеўрапейская магістраль

**Цяпер кіроўцы аўтамашын, якія едуць ад сталіцы Літвы ў бок Беларусі, могуць уздыхнуць з палёгкай. Раней намечаных тэрмінаў закончылася рэканструкцыя літоўскай часткі трансеўрапейскай дарогі Е28 (А3).**

Гэты адрэзак шляху вельмі інтэнсіўна эксплуатаваўся. За суткі тут праязджала больш як 3,5 тысячы аўтамабіляў, кожны чацвёрты з іх — грузавы.

Падчас мадэрнізацыі дарогі ўкаранёны найноўшыя меры бяспекі руху і аховы навакольнага асяроддзя, ажыццёўлена рэканструкцыя электрычных і электронных камунікацыйных сетак і меліярацыйных сістэм, асвятленне пешаходных пераходаў. На гэтым участку заменена старое бетоннае пакрыццё. Усе работы каштавалі 43,6 млн літаў.

«Рэканструкцыя гэтага ўчастка дарогі будзе спрыяць далейшаму развіццю літоўска-беларускіх эканамічных адносін, павелічэнню тавараабароту, паляпшэнню ўмоў для турызму. Для беларусаў палепшацца і зносіны з Клайпедскім марскім портам», — сказаў, віншуючы будаўнікоў з паспяховым заканчэннем работ, **міністр зносін Літвы Рымантас СІНКЯВІЧУС.**

Так ужо склалася, што і Вільнюс пастараўся. Будаўнічыя работы 2-га этапу Заходняй аб'язной дарогі ў Вільнюсе таксама ўдалося завяршыць раней намечаных тэрмінаў. Пракладзена паралельная праспекту Лайсвес хуткасная вуліца працягласцю 2,84 км з шасціпалосным рухам у абодва бакі. Цяпер кіроўцы, якія едуць з боку Мінска або Каўнаса, змогуць ездзіць на хуткасці 80 км па Укмяргскім накірунку, абыходзячы цэнтр горада і многія мікраараёны. А гэта прамая дарога не толькі ва Укмярге, але і ў Панявежыс, Рыгу.

«Кошт будаўніцтва другога этапу гэтай дарогі склаў больш як 211 млн літаў. Дзякуючы гэтым інвестыцыям нарэшце ў корані зменіцца сітуацыя на праспекце Лайсвес, па якім за суткі праязджае больш як 30 тыс. аўтамабіляў. Палепшацца ўмовы і для транзітнага транспарту, які рухаецца з Мінска ў Рыгу, Талін. Радуе, што гэты падарунак для ўсіх кіроўцаў удалося зрабіць яшчэ да Каляд», — сказаў **мэр Вільнюса Артурас ЗУОКАС.**

Добрыя дарогі толькі збліжаюць. Тым больш такія суседнія краіны, як Літва і Беларусь, тавараабарот паміж якімі з кожным годам павялічваецца. У 2012 годзе ён упершыню перавысіў 1,5 млрд долараў ЗША. Немалая доля гэтых тавараў была перавезена па дарозе Вільнюс — Мінск.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.**

*Вільнюс.*

■ «Міс Віцебск-2013»

# МУЖЧЫНЫ ВЫБІРАЮЦЬ... БРУНЕТАК

**13 — менавіта гэты парадкавы нумар удзельніцы конкурсу «Міс Віцебск-2013» стаў для 22- гадовай студэнткі Веранікі Рыдкінай шчаслівым. Яна вучыцца на пятым курсе Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.**



Вераніка РЫДКІНА, пераможца конкурсу прыгажосці.

Брунетка на конкурсе заваявала галоўны тытул. Яна таксама стала «Міс глядацкіх сімпатый» — па выніках інтэрнэт-галасавання, якое да апошніх хвілін фіналу праводзілася на папулярным віцебскім партале. У выніку атрымалася так, што журы і народ былі аднадушныя пры вызначэнні каралевы. Як высветлілася, сэрца самай прыгожай дзяўчыны Віцебска свабоднае. Яна ўжо з каронай на галаве прызналася журналістам, што падчас фіналу конкурсу за яе ў зале «хварэў» бацька — самы любімы мужчына. Вераніка на шоу даказала ўсім, што думкі насамрэч матэрыяльныя. Падчас конкурсу, адказваючы на пытанне вядучых, сказала, што з дзяцінства марыла аб кароне каралевы прыгажосці.

Не менш цікава, што дзве сястры — Святлана і Яна Гарбачовы — сталі ўладальніцамі тытула «Віцэ-міс Віцебск-2013». Святлана, дарэчы, сёлета стала пераможцай конкурсу «Міс Дажынкі-2013».

Былі вызначаны ўладальніцы і іншых тытулаў, у тым ліку «Міс тэлебачанне», «Міс фота», «Міс грацыя»...

Віцебск называюць горадам самых прыгожых дзяўчат. Тое, што віцебскія прыгажуні — адны з самых прыгожых не толькі ў нашай маленькай краіне, у 1990 годзе пацвердзіла Марыя Кежа. Тады гэтая 17-гадовая студэнтка Віцебскага тэхналагічнага інстытута (*цяпер універсітэт.* — **Аўт.**) стала «Міс СССР» — апошняй уладальніцай гэтага тытула падчас існавання Савецкага Саюза. Да гэтага яна ж таксама перамагла ў гарадскім конкурсе прыгажосці — «Міс Віцебск-1989», а потым — у нацыянальным конкурсе. Ганаруся, што асабіста знаёмы з Марыяй, з якой пасябраваў у хуткім часе пасля яе каранавання. Цяпер Марыя — парыжанка, аўтар вельмі папулярнай сярод «зорак» калекцыі жаночых сумак. Ёй жа належаць уласныя брэнд і дом моды Masha Keja.

У тым, што ў Віцебску па-ранейшаму шмат прывабных і абаяльных маладых гараджанак, упэўніліся тыя, хто сталі сведкамі фіналу гарадскога конкурсу прыгажосці, які прайшоў у канцэртнай зале «Віцебск». Падчас фіналу яблыку недзе было ўпасці. Напэўна, яшчэ і таму, што мінулы аналагічны конкурс праводзіўся ў абласным цэнтры ажно ў 2004 годзе.

Сёлета за галоўную карону конкурсу прыгажосці змагаліся 16 дзяўчат. Да ўдзелу ў кастынгу дапускаліся дзяўчаты са стрыманым макіяжам, ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў, ростам не менш за 175 сантыметраў, якія не замужам і не маюць дзяцей.

Журы фіналу ўзначальваў **Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.** Сярод іншых яму дапамагала судзіць **Вольга ХІЖЫНКОВА, «Міс Беларусь-2008».** Яна, дарэчы, таксама родам з Віцебшчыны: нарадзілася ў Лепельскім раёне. Нагадаю, што Вольга брала ўдзел у конкурсе «Міс свету-2008».

Шоу прайшло як «парад стыхій»: зямлі, вады, паветра і агню. І падчас «прэзентацыі» кожнай стыхіі дзяўчаты выходзілі на сцэну ў новых «вобразах». Бурныя апладысменты выклікала з'яўленне на сцэне прыгажунь у вясельных строях. Безумоўна, мужчыны ў глядзельнай зале з нецярпеннем чакалі выхаду ў купальніках. І нездарма: вачэй нельга было адарваць ад высокіх, стройных дзяўчат. Даволі нестандартна прайшоў «інтэлектуальны» конкурс.

— Гэта мой першы конкурс. Адважыцца ўдзельнічаць у ім для мяне было вельмі складана. Але паспрабавала — для новых эмоцый, уражанняў. Вельмі ўдзячная арганізатарам, бо шмат гадоў у нашым горадзе такога конкурсу не было. Дзякуй таксама тым, хто рыхтаваў нас да ўдзелу ў фінале конкурсу (*спецыялісты па дэфіле, харэографы і іншыя,* — **Аўт.**) — за іх цярпенне, штодзённыя рэпетыцыі. Падчас падрыхтоўкі да фіналу і падчас яго было вельмі цяжка вытрымаць вялікія фізічныя і маральныя нагрузкі, — падзялілася ўражаннямі **Вераніка РЫДКІНА, уладальніца тытула «Міс Віцебск-2013»**.

Дзяўчына дадала, што не выключае свой удзел у іншых конкурсах прыгажосці.

І шчыра хочацца пажадаць ёй удачы! А Віцебску — новых конкурсаў прыгажосці без доўгіх перапынкаў!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**



Імгненне конкурсу прыгажосці.

# ГАСЦЁЎНІ ДЗЕДА МАРОЗА

**У Полацку ўпершыню з'явяцца гасцёўні галоўнага навагодняга персанажа, а ў раёне ў цэлым іх будзе пара дзясяткаў. Асабліва будуць рады чытачам у гасцёўнях-бібліятэках, дзе ў апошні дзень 2013 года і 1 студзеня будуць чакаць сюрпрызы.**

— З 26 снежня гэтага года па 7 студзеня наступнага больш як дваццаць устаноў культуры Полацка і Полацкага раёна зменяць свае афіцыйныя назвы на «Гасцёўню Дзеда Мароза». Гасцёўні Дзеда Мароза, бясспрэчна, стануць прывабным месцам, крыніцай радасці і карысным баўленнем часу для ўсіх тутэйшых і прыезджых. Там будзе прапанаваны самы шырокі спектр забаўляльных паслуг. У прыватнасці, «Навагодні стол заказаў»: наведнікі змогуць пакінуць заяўку на правядзенне навагодняга мерапрыемства або віншаванне Дзеда Мароза і Снягуркі на даму, у працоўных калектывах; «Навагодняя пошта»: наведнікі змогуць пакінуць свае навагоднія віншаванні і пажаданні, якія Дзед Мароз даставіць адрасату або яны будуць зачытаныя на навагоднім мерапрыемстве; «Навагодняя латарэя»: будуць разыгрывацца прызы і сувеніры для дзяцей і дарослых, — паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама.

У гасцёўнях таксама можна будзе наведаць выставу старадаўніх навагодніх упрыгажэнняў, сямейны музычны канцэрт «Навагодні серпанцін», паўдзельнічаць у розных конкурсах і віктарынах.

— Удзел у такіх насычаных культурна-забаўляльных мерапрыемствах, як конкурс «Снегавік года», спектаклі для дзяцей і дарослых, баль-маскарад, спартыўныя спаборніцтвы на адкрытым паветры, майстар-класы «Чароўная акадэмія Дзеда Мароза», дазволіць сустрэць наступны 2014 год са станоўчымі ўражаннямі і каласальным зарадам аптымізму, — дадалі ў райвыканкаме.

Усіх, хто верыць у цуды і жадае правесці час у навагодняй атмасферы казкі, чакаюць на Полаччыне, дзе гарантаваныя дзівосныя сюрпрызы, добры настрой і маса станоўчых эмоцый.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень гор. Абвешчаны Генеральнай Асамблеяй ААН 20 снежня 2002 года.***

**1781** год — нарадзіўся Дэвід Брустэр, шатландскі фізік. Перш чым стаць вучоным-фізікам, ён паспрабаваў сябе ў многіх прафесіях. Быў фармацэўтам, доктарам права, адвакатам, нават прыняў сан святара і стаў адным з заснавальнікаў Свабоднай шатландскай царквы. Але з 1801 года Брустэр так захапіўся праблемамі оптыкі і палярызацыі святла, што прысвяціў навуцы ўсё далейшае жыццё. Ён быў заснавальнікам Брытанскай асацыяцыі навуковага прагрэсу і аўтарам некалькіх важных адкрыццяў у галіне оптыкі. Але вядомым стаў дзякуючы вынаходству калейдаскопа. Пасля публікацыі «Трактата аб калейдаскопе» вынаходка Дэвіда Брустэра стала вельмі папулярнай, хоць спачатку яго выкарыстоўвалі як навуковы прыбор.

**1920** год — у БССР была створана Надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці (спецыяльная камісія пры Народным камісарыяце асветы БССР, якая ў 1920-30 гадах кіравала навучаннем непісьменных і малапісьменных). У 1921-22 навучальным годзе ў беларускіх школах для непісьменных займаліся 12,2 тыс. чалавек. У ліквідацыі непісьменнасці актыўна ўдзельнічалі так званыя культармейцы — рабочыя, інтэлігенцыя, навучэнцы. Вялікую дапамогу камісіям аказвала створаная ў 1923 г. грамадска-палітычная арганізацыя «Далоў непісьменнасць». У 1929 годзе ў рэспубліцы працавала каля 4 тысяч пунктаў і гурткоў па ліквідацыі непісьменнасці (75 тысяч навучэнцаў). Непісьменнасць сярод дарослага насельніцтва ў БССР у асноўным была ліквідавана да 1932 года.




**1938** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (г. Рэчыца) Валерый Мітрафанавіч Лемеш, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарных навук, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Беларусі (1994-2002), член-карэспандэнт НАН Беларусі (2003), доктар ветэрынарных навук, прафесар. Аўтар больш як 250 навуковых прац. Навуковыя даследаванні прысвечаны вывучэнню анкапаталогіі жывёл. Распрацаваў метады эпізаатагалічнага аналізу, якія дазволілі вызначыць сітуацыю і шляхі распаўсюджвання лейкозу, навукова абгрунтаваную сістэму аздараўленчых мерапрыемстваў.

Было сказана — **Янка БРЫЛЬ, народны пісьменнік Беларусі:**

***«Чалавечы дар праяўляе ўласцівасць захоўвацца ў свежым выглядзе да самага паважанага ўзросту».***

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.18 | 16.47 | 7.29 |
| Віцебск | — 9.15 | 16.29 | 7.14 |
| Магілёў | — 9.08 | 16.37 | 7.29 |
| Гомель | — 8.56 | 16.42 | 7.46 |
| Гродна | — 9.32 | 17.04 | 7.32 |
| Брэст | — 9.24 | 17.13 | 7.49 |

### Месяц

***Першая квадра 9 снежня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.** Аляксея, Васіля, Івана, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сцяпана, Фёдара.*
***К.** Данута, Клары, Сабіны, Даніэля, Сцяпана.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Спачатку я хацела адбяліць сабе зубы. Але потым усё ж палічыла за лепшае пайсці ў салярый.**

— Дзяўчына, а можна запрасіць вас у кіно?
— А чым вам Мальдывы не падабаюцца?

**Выдаючы мяне замуж, родныя казалі: «У нас тавар, а вам — капец!».**

Аб'ява ў офіснай кухні: «Пасля трэцяга піску мікрахвалёўкі ежа становіцца агульнай!»




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.416. Індэкс 63850. Зак. № 5378.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 снежня 2013 года.